

ПАЛАСАТЫ УРАДЖАЙ СМАЧНЫ. КАРЫСНЫ? **5**

СІБІРАКІ ПАМЯТАЮЦЬ ПРА СВАІХ ЗЕМЛЯКОЎ-ПЕРАМОЖЦАЎ **20**



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

16 ЛІПЕНЯ 2021 г.
ПЯТНІЦА
№ 134 (29503)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
+TV ПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Раман ГАЛОЎЧАНКА, прэм'ер-міністр:**

*«Развіццё рэгіёнаў — ключавы аспект дынамічнага сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Мы шмат зрабілі для рэспубліканскіх прадпрыемстваў, Мінска, абласных цэнтраў, цяпер на парадку дня — рэгіёны. Адна з задач — сканцэнтраваць увагу на камфортным сацыяльным жыцці насельніцтва, гэта значыць, забяспечыць дзяцей адукацыяй, усіх жыхароў — медыцынскімі паслугамі, сферай адпачынку».*

## КОРАТКА

- Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прызначыў генерал-маёра Віктара Лісоўскага намеснікам начальніка Аб'яднанага штаба Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы. На пасаду начальніка Ваеннай акадэміі прызначаны генерал-маёр Генадзь Ляпешка.
- **Стаўка рэфінансавання з 21 ліпеня павышаецца да 9,25% гадавых.**
- Прэміямі спецфонду Прэзідэнта па падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў заахвочаны 1013 чалавек.
- **У Мінску з пачатку года ў ДТЗ з удзелам мотатранспарту тры чалавекі загінулі, 21 траўмаваны.**
- Беларуская паэзія і музыка загучаць на свяце «Ракуцёўскае лета» ў Маладзечанскім раёне.
- **З пачатку года ў Беларусі МНС зарэгістравала 96 выпадкаў, калі людзі заблукалі ў лесе.**
- Урад перадаў функцыі заснавальніка грамадскай установы «Санаторый «Беларусь» у літоўскім Друскініскай Рэспубліканскаму цэнтру па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва.

ISSN 1990 — 763X

# КІРМАШОВЫ НАСТРОЙ



Фота БелТА.

Каля 280 рамеснікаў з Беларусі, Расіі і Украіны прадставілі свае вырабы на Задзвінскім кірмашы, які пачаў працаваць 14 ліпеня на тэрыторыі культурна-гістарычнага комплексу «Залатое кальцо горада Віцебска «Дзвіна» ў рамках XXX Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску».

## Новая зорка на фестывальнай плошчы

**Імянная зорка даўняга сябра «Славянскага базару» Мікалая БАСКАВА з'явілася на плошчы Зорак у Віцебску, паведамляе БелТА.**



Фота БелТА.

Мікалай Баскаў стаў чарговым лаўрэатам спецыяльнай узнагароды Прэзідэнта Беларусі, і ў якасці прыемнага бонусу на плошчы Зорак каля Летняга амфітэатра заклалі імянную зорку артыста.

«Гэта вялікі гонар для мяне. «Славянскі базар у Віцебску» займае ў маім жыцці асаблівае месца. Я прыехаў на фестываль 22 гады таму, у 1999 годзе. Гэта гісторыя майго пачатку, мой першы фестываль. «Славянскі базар» расчыніў свае дзверы, я выйшаў на гэтую праслаўленую сцэну, і тут адбылося маё баявое хрышчэнне», — адзначыў Мікалай Баскаў.

Спецыяльную ўзнагароду Прэзідэнта «Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення» ўручыў спеваку **міністр культуры Анатоль МАРКЕВІЧ.** «Сёння нас сабрала ўнікальная нагода — уручэнне спецыяльнай узнагароды Прэзідэнта Мікалаю Баскаву. Вы з'яўляецеся чалавекам, які робіць вялікі ўнёсак у развіццё сучаснага музычнага мастацтва і ўпісаў сваё імя ў гісторыю фестывалю. Паверце, што ў нашай Сінявокай вас заўсёды чакаюць, цэняць і любяць», — падкрэсліў міністр культуры.

Учора позна ўвечары адбылося ўрачыстае адкрыццё фестывалю. Аб гэтым — ужо сёння на сайце zviazda.by і ў заўтрашнім нумары газеты.

Ведай сваіх

## Спартсменка, матуля, судовы эксперт

### Як спалучае ў сабе маці траіх дзяцей кар'еру баксёра і работу па пошуку крымінальных слядоў

**Марыя БЕЛУШ — усмешлівая і прывабная дзяўчына са спакойным голасам і адкрытым тварам. Калі яна ў цывільным і на абцасах, ніколі не здагадаешся, што перад вамі — шматдзетная мама, першая ў Беларусі чэмпіёнка свету па Муай Тай сярод жанчын і кваліфікаваны спецыяліст Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз, які прыкмячае драбнюткія дэталі. Як удаецца спалучаць працу матулі, мужчынскую работу і жорсткі спорт, яна падзялілася з карэспандэнтам «Звязды».** СТАР. 4



# Дзеля абароны суверэнітэту

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў закон «Аб змяненні законаў па пытаннях абароны суверэнітэту і канстытуцыйнага ладу». Пра гэта паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

У адпаведнасці з дакументам, уносяцца папраўкі ў Закон «Аб надзвычайным становішчы». Згодна з Канстытуцыяй і гэтым законам, падставай для ўвядзення надзвычайнага становішча (акрамя стыхійных бедстваў і катастроф) з'яўляецца наяўнасць беспарадкаў, што суправаджаюцца гвалтам або пагрозай гвалту з боку групы асоб і арганізацый, у выніку якіх узнікае небяспека для жыцця і здароўя людзей, тэрытарыяльнай цэласнасці ды існавання дзяржавы. Аднак раней не было вызначана, што менавіта лічыцца беспарадкамі. Гэта выклікала неаднаначнае разуменне падстаў для ўвядзення надзвычайнага становішча, асабліва калі беспарадкі не з'яўляюцца відавочна масавымі.

Таму ў законе, падпісаным кіраўніком дзяржавы, канкрэтызуецца, што да беспарадкаў адносяцца спробы насільнага змянення канстытуцыйнага ладу, захопу або прысваення ўлады, узброены мяцеж, масавыя беспарадкі, міжнацыянальныя і міжканфесійныя канфлікты, якія суправаджаюцца гвалтоўнымі дзеяннямі, ствараюць непасрэдную пагрозу жыццю і бяспецы грамадзян.

Новым законам таксама ўдакладняецца пералік магчымых надзвычайных мер і часовых абмежаванняў, якія прымяняюцца пры ўвядзенні надзвычайнага становішча. Гэта норма распрацавана з улікам вопыту рэагавання на беспарадкі ў 2020 годзе. Так, пералік магчымых надзвычайных мер і часовых абмежаванняў дапаўняецца прыпыненнем выпуску і распаўсюджвання прадукцыі СМІ (уключаючы замежныя), устанаўленнем асаблівага парадку акрэдытацыі журналістаў, абмежаваннем доступу да інтэрнэт-рэсурсаў і сеткавых выданняў. Адпаведна ўдакладняюцца і дапаўняюцца паўнамоцтвы каменданта тэрыторыі, на якой уведзена надзвычайнае становішча.

Пашыраецца кола сілавых органаў, якія прыцягваюцца да забеспячэння рэжыму надзвычайнага становішча, за кошт уключэння ў іх лік ваенізаваных арганізацый. Гэта дасць магчымасць максімальна эфектыўна і на поўных законных падставах задзейнічаць сілы і сродкі МНС, Следчага камітэта, Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз і Дэпартамента фінансавых расследаванняў. Задачы, якія выконваюць прыцягнутыя органы, дапоўнены папярэджаннем і спыненнем беспарадкаў, забеспячэннем аховы грамадскага парадку і грамадскай бяспекі.

Акрамя таго, прыцягненне Узброеных Сіл да вырашэння задач у складзе дзяржаўнай сістэмы рэагавання замацоўваецца ў Законе «Аб Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь». З улікам атрыманага практычнага вопыту называюцца задачы Узброеных Сіл у рамках гэтай сістэмы: барацьба з тэрарызмам, ахова грамадскай бяспекі, спыненне масавых беспарадкаў, ажыццяўленне бяспекі ахоўных асоб і ахоўных аб'ектаў.

Разам з гэтым у законы «Аб надзвычайным становішчы» і «Аб ваенным становішчы» імплементуюцца нормы Дэкрэта Прэзідэнта нумар 2 ад 9 мая 2021 года «Аб абароне суверэнітэту і канстытуцыйнага ладу».

## У цэнтры ўвагі

# КАНСТЫТУЦЫЯ БУДУЧЫНІ КРАІНЫ

**Учора ў рамках чарговага пасяджэння савета старэйшын пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі адбылася сустрэча і шчырая цёплая размова спікера верхняй палаты парламента Наталлі КАЧАНАВАЙ з гэтымі мудрымі, з вялізарным практычным і жыццёвым досведам і добра вядомымі ў краіне людзьмі. У цэнтры ўвагі суразмоўцаў было пытанне аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю.**



Фота БелТА.

І, як паказала практыка і час, ініцыятыва стварэння савета старэйшын была своечасовай. Невыпадкова, відаць, Наталля Качанава ў самым пачатку размовы дала зразумець, што восць і цяпер узнікла неабходнасць параіцца з людзьмі з вопытам, членамі Савета Рэспублікі папярэдніх скліканняў. Бо ад гэтага якасць абмеркавання такога важнага пытання, як змены ў Асноўны Закон, толькі выйграе.

Наталля Качанава патлумачыла, што ўказам Прэзідэнта створана адпаведная Канстытуцыйная камісія, а таму мы «павінны распрацаваць Канстытуцыю будучыні нашай краіны. І ўжо прайшло восем пасяджэнняў Канстытуцыйнай камісіі. 1 жніўня мы павінны праект Канстытуцыі з прапановамі, якія паступілі ад грамадзян, калектываў, службовых асоб, унесці на разгляд кіраўніку дзяржавы. Відома, гэта не канчатковы варыянт, будзе ўсенароднае абмеркаванне. Плануецца, што ў пачатку наступнага года абноўленая Канстытуцыя будзе вынесена на рэферэндум», — падкрэсліла старшыня Савета Рэспублікі.

На думку Наталлі Качанавай, у савет старэйшын уваходзяць людзі мудрыя, з вялікім вопытам дзяржаўнай службы. Адсюль і рашэнне: «сустрэцца з вамі, абмеркаваць некаторыя новыя канцэптуальныя прапановы, якія Канстытуцыйная камісія прапануе ўнесці ў Асноўны Закон краіны. І ваша меркаванне будзе нам вельмі важна, таму што вы, людзі дзяржаўныя, шмат гадоў адпрацавалі на карысць краіны», — зазначала спікер верхняй палаты парламента.

Як заўважыў у размове з журналістамі **старшыня савета старэйшын Барыс БАТУРА,** той досвед, які назапашаны людзьмі з вялікім стажам працы на кіруючых пасадах у розных сферах, павінен быць запатрабаваны. Бо пры вырашэнні любых сур'ёзных пытанняў, якія датычацца ў той ці іншай ступені развіцця нашай дзяржавы, заўсёды ёсць сэнс параіцца з такімі людзьмі. Напрыклад, па тых жа зменах у Канстытуцыю. І на гэтую надзвычай сёння актуальную тэму старэйшынам ёсць што сказаць, парэкамендаваць і прапанаваць. Гэта ж асноўны закон жыцця нашай дзяржавы і без яго ўсенароднага абмеркавання нельга абысціся, сказаў Барыс Батура. Ён, дарэчы, у свой час узначальваў Савет Рэспублікі чацвёртага склікання.

Нагадаем, першае пасяджэнне савета старэйшын пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі сёмага склікання адбылося напрыканцы 2020 года. Само жыццё падказала тады неабходнасць звярнуцца да вопыту людзей, якія прайшлі школу парламентарызму. Іх працоўны стаж на кіруючых пасадах, веды і нават інтуіцыя дазволілі б зрабіць абмеркаванне важных пытанняў палітычнага, гуманітарнага, сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі больш плённым і выніковым.

**Член савета старэйшын Анатоль РУСЕЦКІ,** які яшчэ адносна нядаўна працаваў намеснікам старшыні Савета Рэспублікі пятага склікання, падкрэсліў, што рашэнні савета старэйшын носяць рэкамендацыйны характар, а іх дзейнасць ажыццяўляецца на грамадскіх пачатках. І таму вельмі важна прыслухоўвацца да пакалення, якое стварала нашу краіну, часам у няпростых абставінах набывала, безумоўна, карысны для сённяшніх маладых людзей досвед. Патэнцыял ветэранаў можа яшчэ паслужыць радзіме, у тым ліку і пры абмеркаванні праекта абноўленай Канстытуцыі. А ўвогуле, па зменах у яе беларусы прымуць правільнае рашэнне, як рабілі гэта заўсёды, лічыць Анатоль Русецкі.

Падчас пасяджэння Наталля Качанава праінфармавала старэйшын і аб іншых кірунках дзейнасці верхняй палаты парламента. У прыватнасці, аб тым, што сёння Савет Рэспублікі актыўна працуе з насельніцтвам на месцах, сенатары часта сустракаюцца з людзьмі, каб лепш разумець, што хвалюе жыхароў рэгіёнаў. У гэтай рабоце ўдзельнічае ўвесь дэпутацкі корпус. На пасяджэнні сесій Савета Рэспублікі запрашаюцца старшыні раённых, гарадскіх і пасялковых Саветаў дэпутатаў.

Як патлумачыла Наталля Качанава, мясцовыя Саветы — «гэта вельмі патрэбная форма. Чым больш будзе людзей, якія працуюць з народам на месцах, тым большым будзе поспех у рэалізацыі ўсіх задач, якія пастаўлены перад намі», — сказала старшыня Савета Рэспублікі. Яна таксама звярнулася да тэмы ўмяшання ў справы Беларусі звонку. Паводле яе слоў, мы павінны сёння жорстка ставіць заслон усім спробам знешняга ўмяшання ва ўнутраныя справы краіны, не дапусціць яе знішчэння. Галоўная мэта — захаванне тэрытарыяльнай цэласнасці, суверэнітэту і незалежнасці. «Мы разумеем сваю адказнасць за будучыню Беларусі», — акцэнтавала ўвагу прысутных спікер верхняй палаты парламента.

**Мікалай ЛЮБЧАНСКІ.**


# ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**

Продавец: **ОАО «Житковичлес»** (УНП400049968), 247960, Гомельская обл., г. Житковичи, ул. К. Маркса, 80, в лице ликвидатора Лахвича Василия Адамовича, тел. 8 (02353) 2-18-74.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **29 июля 2021 г. с 09.00 до 17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY**.

| № п/п | Предмет торгов | Где находится | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|---|
| 1 | Машина транспортно-погрузочная лесная МТПЛ 5-11, гос. № 6086 ЕК-3, 2018 г. в. | 1 | 33 250,00 |
| 2 | Машина транспортно-погрузочная лесная МТПЛ 5-11, гос. № 6089 ЕК-3, 2010 г. в. | 1 | 26 932,50 |
| 3 | Машина транспортно-погрузочная лесная МТПЛ-5-11, гос. № 4548-3 ЕК, 2018 г. в. | 1 | 27 360,00 |
| 4 | Автомобиль МАЗ 6303-А8, гос. № АЕ 7921-3, с манипулятором гидравлическим М-75-04, 2010 г. в. | 1 | 30 780,00 |
| 5 | Прицеп МАЗ 837810 (022), гос. № А 4816 А-3, 2010 г. в. | 1 | 8 550,00 |
| 6 | МАЗ-5551 Самосвал, гос. № АВ 33-55-3, 1991 г. в. | 1 | 7 618,05 |
| 7 | Автомастерская ЗИЛ 131 ПРМ, гос. № АІ 3858-3, 1990 г. в. | 1 | 4 873,50 |
| 8 | Автомашина «УРАЛ 4320-3», гос. № ЕМ 6265, 1996 г. в. (без постановки на учет) с гидроманипулятором ПЛ 70-02, 2002 г. в. | 1 | 11 080,80 |
| 9 | Автомобиль УАЗ*390945*330 № двиг. 409100*В3044904, № шасси 330360В0459912, гос. № АІ 1144-3, 2010 г. в. | 1 | 6 232,95 |
| 10 | Легковой автомобиль «Фольксваген Пассат», гос. № 2054 ВС-3, 1998 г. в. | 1 | 6 232,95 |
| 11 | Полуприцеп УПП1212, 1993 г. в. (без постановки на учет) | 1 | 2 462,40 |
| 12 | Газ 53 автоцистерна АЦ-4.2, гос. № АА 9628-3, 1983 г. в. | 1 | 11 080,80 |
| 13 | Автомобиль «УАЗ-452», гос. № 7844-3 АО, 1980 г. в. | 1 | 4 155,30 |
| 14 | Автомобиль УАЗ 390995-460-04, гос. № 1663-3 АМ, двиг. № 409110*Н3036855, VIN: ХТТ 390995J202995, 2017 г. в. | 1 | 14 535,00 |
| 15 | МАЗ-53336 (бортовая), гос. № АК 21-49, 1991 г. в. | 1 | 10 388,25 |
| 16 | Прицеп бортовой МАЗ 8926, гос. № 3785 АА, 1993 г. в. | 1 | 2 770,20 |
| 17 | Автопогрузчик (львовский), 1990 г. в., инв. № 000260 | 2 | 4 847,85 |
| 18 | Грузовой бортовой ГАЗ-66-12, гос. № 4033-3 АМ, ш.0456045, дв.109082, 1986 г. в. | 1 | 8 464,50 |
| 19 | Автомобиль «Урал-375», гос. № 0813-3 АМ, 1980 г. в., (без постановки на учет) | 1 | 6 579,23 |
| 20 | Грузовой спец. лесовоз «УРАЛ-375А», гос. № 0812-3 АМ, 1980 г. в. (без постановки на учет) | 1 | 9 003,15 |
| 21 | Брусующий станок TS 52-2R, инв. № 231 | 2 | 13 122,00 |
| 22 | Многопильный станок DS-55-IR, инв. № 233 | 2 | 12 465,90 |
| 23 | Вентилятор ВЦП6-45 № 8 с дв. 30/1500люб. вращения ХВ, инв. № 238 | 2 | 2 077,65 |
| 24 | Вентилятор ВЦП6-45 № 8 без электродвигателя ХВ, инв. № 318 | 2 | 207,77 |
| 25 | Пилорама РПМ-02-К б/у, инв. № 397 | 2 | 4 847,85 |
| 26 | Станок строгальный 4-сторон., инв. № 45 Т | 2 | 6 925,50 |
| 27 | Станок Ц-6-2, инв. № 54 Т | 2 | 831,06 |
| 28 | Станок ШЛД-6, инв. № 56 Т | 2 | 1 385,10 |
| 29 | Лесопильная рама ЛРВ-1 № 6951, инв. № 514 | 2 | 6 579,23 |
| 30 | Станок брусовочный двухвальный | 1 | 13 851,00 |
| 31 | Вентилятор ВЦП 7-40 № 8 без эл. дв., инв. № 565 | 2 | 1 385,10 |
| 32 | Бензопила «Штиль 362» (цепь, шина) № 179524241, инв. № 475 | 1 | 415,53 |
| 33 | Бензопила MS361, № 182712442, инв. № 505 | 1 | 484,79 |
| 34 | Бензопила MS361, № 183177620, инв. № 508 | 1 | 484,79 |
| 35 | Бензопила MS361, № 183177621, инв. № 513 | 1 | 484,79 |
| 36 | Бензопила MS361, № 183197862, инв. № 519 | 1 | 484,79 |
| 37 | Бензопила MS361, № 183864091, инв. № 540 | 2 | 484,79 |
| 38 | Кусторез FS 460 С-ЕМ (с ножом для молодняка), инв. № 483 | 1 | 1 038,83 |
| 39 | Молот пневматический, инв. № 000885 | 1 | 3 462,75 |
| 40 | Станок сверлильный 2Н 135, инв. № 001310 | 1 | 1 615,95 |
| 41 | Станок вертикально-фрезерный, инв. № 001311 | 1 | 3 078,00 |
| 42 | Мотопомпа, инв. № 001427 | 1 | 1 731,38 |
| 43 | Гидроманипулятор ОМТЛ-97, инв. № 262 | 1 | 4 155,30 |
| 44 | Станок мод. В3-367 точильно-шлифовальный, металлореж., инв. № 36 | 1 | 461,70 |
| 45 | Заточной станок Б/У, инв. № 68 | 1 | 153,9 |
| 46 | Пост для ремонта легковых автомобилей, инв. № 001666 | 1 | 1 731,38 |
| 47 | Кондиционер GREE GWH12NA-K3NNB3A/1, инв. № 486 | 1 | 484,79 |
| 48 | Кондиционер GREE GWH07AAA-K3NNA2A, инв. № 503 | 1 | 415,53 |
| 49 | Кондиционер GREE GWH12AAB-K3NNB2A, инв. № 504 | 1 | 484,79 |
| 50 | Кондиционер GREE GWH12NA-K3NNB3A/2, инв. № 487 | 1 | 484,79 |
| 51 | Кондиционер GREE GWH07NA-K3NNB3A, инв. № 488 | 1 | 415,53 |
| 52 | Автомобиль УАЗ 390995-460-04 № 0407-3 АМ, 2017 г. в. | 1 | 14 353,00 |
| 53 | Бензопила MS361 № 172157104, инв. № 571 | 1 | 484,79 |
| 54 | Станок многопильный деревообрабатывающий ЦМР-3 с рольгангами неприводными 3.000 (2 шт.), инв. № 563 | 1 | 6 840,00 |
| 55 | Машина транспортно-погрузочная лесная МТПЛ-5-11, гос. № 5460-3 ЕК | 1 | 35000,00 |
| 56 | Трактор трелевочный ТТР-401 М-05 гос. № ЕК-3 7131 2010 г. | 1 | 17100,00 |

**Местонахождение:**
**1 – Гомельская обл., г. Житковичи, ул. Комсомольская, 45а,**
**2 – Гомельская обл., Житковичский р-н, п. Хвоенск.**
**Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-18.**

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 17.07.2021 г. с 09.00 по 28.07.2021 г. до 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 28.05.2021 г.

Грошы

# Амаль удвая павысіліся стаўкі па банкаўскіх укладах

**У канцы чэрвеня Нацыянальны банк зняў абмежаванні па даходнасці ўкладаў у замежнай валюце, якія дзейнічалі з 2019 года. У сувязі з гэтым прынята рашэнне павысіць прывабнасць сваіх дэпазітаў, зрабіць іх больш выгаднымі.**

Практычна ўсе камерцыйныя банкі павысілі стаўкі па ўкладах для фізічных асоб у беларускіх рублях, доларах і еўра. У некаторых выпадках працэнты выраслі больш чым у два разы.

Напрыклад, у банку «Дабрабыт» больш выгадныя сталі ўмовы тэрміновых безадзыўных банкаўскіх укладаў (дэпазітаў). Стаўкі выраслі па ўсіх тэрмінах размяшчэння. Найбольшы рост склаў 8,55 % для дэпазітаў у беларускіх рублях, 2,25 % — для дэпазітаў у доларах і 1,8 % — у еўра. Так, ва ўкладзе «Шчодры» стаўка ў беларускіх рублях пры размяшчэнні на тры месяцы павялічылася з 17 % да 18,55 %, на 13 месяцаў — з 16,5 % да 18,6 %, на 24 месяцы — з 12,25 % да 18,3 %, а найбольш высокая стаўка цяпер у дэпазітаў з тэрмінам размяшчэння на сем месяцаў — 19,5 % гадавых.

У замежнай валюце працэнтныя стаўкі не настолькі ўражальныя, але яны маюць тэндэнцыю да росту. У «Беларусбанку» такія доларавыя дэпазіты, як «Класік безадзыўны On-line з фіксаванай працэнтнай стаўкай», «Бонусны безадзыўны Анл@йн», тэрміновы безадзыўны банкаўскі ўклад «Беларусбанк — анл@йн» і «Дзіцячы Безадзыўны» маюць максімальную стаўку да 3,5 % гадавых.

На невялікі час банкі прапануюць меншую прыбытковасць, але менавіта гэтыя стаўкі найбольш папулярныя цяпер у насельніцтва. Раней «кароткія долары» аўтаматычна траплялі ў разрад укладаў другога сорту з мінімальнымі працэнтамі. Цяпер нават «кароткія грошы» сталі даражэйшыя. У доларах на тры месяцы стаўка павялічана з 1,25 % да 2,4 %. Больш выгадныя ўмовы можна скарыстацца, калі выбраць размяшчэнне ад 7 да 61 месяца — тут стаўка цяпер складае фіксаваныя 3,5 % гадавых.

У еўра на тры месяцы стаўка вырасла з 1 % да 1,8 %, на сем месяцаў — з 1 % да 2,8 %. Максімальная стаўка 3 % гадавых дзейнічае пры заключэнні дагавора ад 13 да 60 месяцаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# Выканкамы чакаюць званкоў

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, 17 ліпеня, з 9.00 да 12.00, праводзяць:

- намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;
- старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Уладзіміравіч ЦЯРЭНЦЬЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;
- намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Андрэй Анатолевіч БАРАНОЎСКІ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Сцяпанавіч КАРАНІК. Тэл. 8 015 273 56 44;
- намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Сяргей Мікалаевіч МАСЛАЎ. Тэл. 8 022 250 18 69;
- кіраўнік спраў Мінскага аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ГУРЫНОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;
- першы намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Дзмітрый Міхайлавіч МІКУЛЁНАК. Тэл. 8 017 222 44 44.

На слыху

# СААЗ абвясціў пра пачатак трэцяй хвалі COVID-19 у свеце

**Кіраўнік Сусветнай арганізацыі аховы здароўя Тэдрас Аданам Гебрэісус заявіў пра пачатак трэцяй хвалі каранавіруса ў свеце.**

— Чацвёрты тыдзень колькасць хворых павышаецца на глабальным узроўні — за выключэннем аднаго ў пяці рэгіёнах. Мы адзначаем гэты рост пасля 10 тыдняў зніжэння захваральнасці. З усіх рэгіёнаў мы атрымліваем звесткі аб росце колькасці захварэлых і тым, што бальніцы перапоўнены. Варыянт «дэльта» паражае з імклівай хуткасцю, — падкрэсліў доктар Тэдрас.



Ён канстатаваў, што ў краінах з невысокім ахопам вакцынацыяй «дэльта» распаўсюджваецца хутка. Там адзначаецца высокі ўзровень шпіталізацый і памерлых. «Дэльта» выяўлены ўжо ў 104 краінах свету.

— Вірус становіцца больш трансмісіўным і кантагіёзным, — адзначыў кіраўнік СААЗ.

Ён заклікаў нарошчваць магутнасці вытворчасці вакцын. І адзначыў, што пакульназіраецца шакіруючая дыспрапорцыя ў глабальным размеркаванні вакцын, з-за чаго большая частка насельніцтва застаецца ўспрымальнай да інфекцыі.

СААЗ заклікае да масавай вакцынацыі. Як мінімум 10 % насельніцтва кожнай краіны павінна прышчапіцца сёлета да верасня, як мінімум 40 % — да канца года, і 70 % — да сярэдзіны 2022-га.

Учора Міністэрства аховы здароўя Беларусі паведаміла пра 991 новага пацыента з выяўленай каранавіруснай інфекцыяй, 1142 чалавекі за гэтыя суткі папраявіліся і выпісаны, не ўдалося ўратаваць дзесяцярых. Усяго з пачатку пандэміі ў краіне захварэла 431 тысяча 112 чалавек, паправіліся 424 тысячы 546 пацыентаў, 3 тысячы 297 чалавек памерлі.

Больш чым 1,2 мільёна беларусаў атрымалі першую дозу вакцыны супраць COVID-19, з іх больш за 747,5 чалавек прайшлі поўны курс вакцынацыі.

# У дзіцячым летніку — успышка інфекцыі

**У дзіцячым лагеры «Шынпік», які размяшчаецца пад Бабруйскам, выяўлена рэспіраторная інфекцыя. Міністэрства аховы здароўя паведамляе, што гэта не COVID-19.**

— У сувязі з рэгістрацыяй выпадкаў рэспіраторнай інфекцыі ў дзяцей, якія знаходзяцца ў летнім аздараўленчым лагеры Шынпік (Бабруйск), спецыялісты санітарна-эпідэміялагічнай службы Магілёўскай вобласці праводзяць эпідэміялагічнае расследаванне. Цяпер тут ажыццяўляецца комплекс санітарна-супрацьэпідэмічных мерапрыемстваў, накіраваных на прадухіленне заносу і распаўсюджвання рэспіраторных інфекцый. Арганізавана лабараторнае даследаванне клінічнага матэрыялу хворых у мэтах этыялагічнай расшыфроўкі выпадкаў. COVID-19 выключаны. Праведзена ацэнка ўмоў знаходжання дзяцей, а таксама ўмоў, што спрыяюць узнікненню захворвання, — праінфармавала прэс-служба ведамства.

Пра колькасць хворых дзяцей не паведамляецца. У прэс-службе дадалі, што сітуацыя знаходзіцца на кантролі ў галоўным упраўленні па ахове здароўя Магілёўскага аблвыканкама і Міністэрства аховы здароўя.

**Алена КРАВЕЦ.**

Надвор'е

# Максімум ужо пройдзены, але яшчэ спякота

У выхадныя — дажджы і навальніцы і да 34 цяпла

**Гарачае надвор'е захаваецца ў нашай краіне да канца гэтага тыдня, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Яны адзначаюць, што ў першай палове ліпеня на тэрыторыі Беларусі тэмпература паветра была на 3—6 градусаў вышэй за кліматычную норму. Разам з тым паветраная маса, якая паступае ў нашу краіну, няўстойлівая і насычана вільгаццю, а гэта значыць, што не выключаныя лакальныя навальнічныя дажджы.

У суботу месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы, прагрымяць навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 17 да 22 цяпла. Удзень — 27—34 градусы.

У нядзелю з Балтыйскага мора перамесціцца атмасферны фронт, і кароткачасовыя дажджы распаўсюдзяцца на большую частку тэрыторыі краіны. Месцамі ў гэты дзень яны будуць суправаджацца навальніцамі, чакаюцца моцныя дажджы (шквалістыя лівні) і ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с, магчымы град. Уначы ад 17 да 22 цяпла. У дзённыя гадзіны — 26—32 градусаў, па паўднёвым усходзе — да 34 цяпла.

Пачынаючы з першых дзён наступнага тыдня, чакаецца паступовае аслабленне гарачыні да камфортных тэмпературных значэнняў.

У панядзелак уначы на большай частцы тэрыторыі, а ўдзень месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 15—22 градусы, а ўдзень — 23—30 цяпла. У аўторак і сераду яшчэ на некалькі градусаў пасвяжэе.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Амерыканскі афіцэр расказаў аб небяспечным становішчы Украіны

**Былы прадстаўнік НАТА ў Расіі, адстаўны капітан першага рангу ВМС ЗША Гары Табах расказаў аб небяспечным і хісткім становішчы краіны з-за адсутнасці падтрымкі з боку заходніх партнёраў, піша РІА Навіны.**

Табах адзначыў, што на гэты момант лідары заходніх краін пакінулі Украіну без падтрымкі, прычым гэта датычыцца адразу некалькіх сфер: эканамічнай, ваеннай, палітычнай і дыпламатычнай. А падзеі ўнутры краіны ўносяць толькі вялікую блытаніну з-за «вялікіх надрыўных дзеянняў», якія падрываюць дзяржаву небяспечна.

На думку Табаха, саюзнікі Украіны на Захадзе сёння не выказваюць вялікага жадання падтрымаць краіну ў барацьбе за свабоду, незалежнасць і дэмакратыю. Наадварот, падкрэсліў ён, многім еўрапейскім дзяржавам выгадна, каб Украіна перыядычна «знікала з радараў».

На тое, што Украіне не варта разлічваць на дапамогу замежных партнёраў, намякнуў і іншы амерыканскі дыпламат, намеснік памочніка дзяржсакратара ЗША па пытаннях Еўропы і Еўразіі Джордж Кент. Ён заявіў, што будучыня краіны знаходзіцца толькі ў яе руках і выбар шляху — яе ўласная адказнасць.

Былы намеснік міністра абароны Грэцыі Костас Ісіхас адзначыў, што цяперашнія ўлады Украіны з'яўляюцца залежнікамі і ў той жа час ахвярамі «гегемоніі» ЗША, гэтак жа, як гэта раней адбывалася і з іншымі краінамі Усходняй Еўропы.

### У Германіі з-за паводак загінулі 19 чалавек

**Колькасць ахвяр паводак на захадзе Германіі вырасла да 19 чалавек, паведамляе выданне Bild. Раней паведамлялася пра 11 загінулых і 70 зніклых без вестак.**



Моцныя дажджы працягваюцца ў краіне з панядзелка з-за ўздзеяння цыклона Бернд. Асноўны ўдар стыхіі прыйшоўся па заходніх і паўднёва-заходнім рэгіёнах, дзе адзначаюцца моцныя апады, у выніку чаго рэкі, у тым ліку Рэйн, выходзяць з берагоў, затапляюцца вуліцы.

Найбольш пацярпелая аказалася зямельная акруга Арвайлер у зямлі Рэйнланд-Пфальц, дзе загінулі мінімум чатыры чалавекі, каля горада Адэнау ў камуне Шульд абрынуліся шэсць дамоў. Усяго ў Рэйнланд-Пфальцы і Паўночным Рэйне-Вестфаліі загінула 19 чалавек. Каля 200 тысяч чалавек засталося без электрычнасці.

У выратавальных работах задзейнічаны, акрамя экстранных службаў, сілы бундэсвера.

### У Маскве пры сутыкненні з самакатам загінуў вядомы біёлаг

**У Маскве самакат збіў вучонага-біёлага, праўнука паэта Фёдара Цютчава, 80-гадовага Івана Пігарава, паведаміў РІА Навіны намеснік дырэктара Інстытута праблем перадачы інфармацыі імя Харкевіча, дзе працаваў навуковец, Кірыл Іваноў.**

Ён расказаў, што вучоны ездзіў на работу на ровары. Здарэнне адбылося на веладарожцы, транспартныя сродкі сутыкнуліся на сустрэчных курсах. У інстытуце доктар біялагічных навук Пігараў працаваў з моманту заснавання — з 1961 года. У апошні час ён займаў пасаду галоўнага навуковага супрацоўніка лабараторыі біяфізікі зроку. Вучоны — аўтар гіпотэзы аб самадыягностыцы арганізма ў перыяд сну — «вісцаральнай тэорыі сну».

# І ВУЧЭННЕ, І БАЯВАЯ РАБОТА

**Менавіта гэтыя словы, як мне здаецца, маглі б стаць дэвізам Рэспубліканскіх спаборніцтваў «Наймацнейшы пажарны-ратавальнік», якія днямі прайшлі на пляцоўцы каля «Мінск-Арэны». Супрацоўнікі МНС з Мінска сталі пераможцамі.**

Гэтыя спаборніцтвы ўяўляюць складаную камбінацыю сілавых і хуткасных нагрузак, якія трэба выканаць за мінімальны час у поўнай экіпіроўцы пажарнага-ратавальніка. Вага такога камплекта — каля 30 кілаграмаў. На шляху да фінішу ўдзельнікам трэба было падняцца з рукаўнай лініяй на пляцоўку чацвёртага паверха спецыяльнай вежы, з яе падняць рукаўную скатку, вага якой 19 кілаграмаў, кувалдай перамясціць жалезную 72-кілаграмовую бэльку, затым прабегчы з пажарным рукавом, запоўненым вадой, і накіраваць струмень вады ў мішэнь, а ў завяршэнне перацягнуць манекен вагой каля 80 кілаграмаў.



У спаборніцтвах удзельнічалі самыя моцныя і мужныя ратавальнікі з усіх рэгіёнаў Беларусі, а таксама з Універсітэта грамадзянскай абароны МНС і рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння «ЗУБР». Тут спаборнічалі не толькі мужчыны, жанчыны нароўні з моцнай паловай праходзілі праз сапраўды складаныя выпрабаванні. На ўрачыстай цырымоніі закрыцця **міністр па надзвычайных сітуацыях Вадзім СІНЯЎСКІ** адзначыў:



— Гэта не проста, будзем казаць так, прастаяць, падыхаць у масцы, гэта ўсё ж баявая работа на павышаных пульсах з магчымасцю сілавога экстрыму. Таму людзі рыхтуюцца да гэтага пастаянна і, шчыра кажучы, не ўсе спецыялісты спецыяльных падраздзяленняў могуць вытрымаць тое, што праходзяць сёння, на гэтых спаборніцтвах, ратавальнікі.

Як лічыць **Дзмітрый ПАШЫК, старшы пажарны-ратавальнік ПАВЧ № 6 г. Мінска,** асобныя этапы даводзіцца трэніраваць, каб запомніць якія-небудзь элементы. «Але складанага тут нічога няма. Проста патрэбная добрая фізпадрыхтоўка. Усе гэтыя практыкаванні важныя ў нашай прафесійнай дзейнасці. Тыя ж самыя пажары ў вышынных будынках, дапамога пацярпелым, у якіх розныя вагавыя катэгорыі. Таму ўсё гэта дапамагае быць гатовымі для нашай дзейнасці», — мяркуе пажарны.

Спаборніцтвы праходзілі ў катэгорыях «Індывідуальныя забегі», «Тандэм» і «Камандная эстафета».

У агульнакамандным заліку трэцяе месца атрымалі ратавальнікі з Віцебскай вобласці. Другое месца заваявалі супрацоўнікі МНС Магілёўшчыны. І пераможцамі сталі ратавальнікі сталічнага гарнізона. Найлепшыя з іх прадставяць нашу краіну на чэмпіянаце свету па пажарна-выратавальным спорце ў Казахстане.

Прафесія пажарнага была і застаецца адной з самых складаных. І справа тут не толькі ў неабходнасці трымаць сябе ў добрай фізічнай форме. Самае цяжкае — перамагчы страх і рызыкнуць сваім жыццём дзеля выратавання іншага чалавека. Супрацоўнікі МНС — сапраўдныя героі, а іх работа — падстава для гонару.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

# Спартсменка, матуля, судовы эксперт

## ТРОЕ ДЗЯЦЕЙ ЗА СЕМ ГАДОЎ

У 22 Марыя выйшла замуж і за сем наступных гадоў паспела нарадзіць траіх дзяцей. Муж Уладзімір, якому тады было 27, хацеў не менш за трох дзетак, пра што адразу і папярэдзіў, спытаў, ці гатовая яна да такога.

— Я адказала, што, напэўна, так. Думала, спыніцца пасля першага, аднак не, — смяецца Марыя Белуш. — Эдзік нарадзіўся, калі я яшчэ працавала супрацоўнікам патрульна-паставой службы міліцыі. З дэкрэта выйшла ўжо на працу экспертам-крыміналістам, а калі з'явіўся камітэт судовых экспертыз — стала судовым экспертам. Пасля другога дзіцяці (дачкі Леры) я выходзіла на працу на тыдзень літаральна і — зноў у дэкрэт, з Настассяй.

На свайго мужа жанчына з мужчынскай прафесіяй не можа нарадавацца:

— Ён у мяне самы лепшы. Дзе трэба — мяне прытармоўвае ці, наадварот, падштурхоўвае. Гэта адзіны мужчына, які здолеў утаймаваць мой нораў. Я бязмерна паважаю яго як чалавека, кахаю як мужа і люблю як бацьку нашых дзяцей.

Сын і дочкі заўжды ў жыцці Марыі: і ў прафесійным, і ў спартыўным, таму яны такія сацыяльна адаптаваныя і самастойныя, упэўнена мама:

— Дзеці павінны вучыцца жыць самастойна з дзяцінства. Вядома, калі ў іх узнікаюць нейкія цяжкасці, напрыклад з аднагодкамі, мы разбіраем такія сітуацыі, аднак я стараюся не ўмешвацца ў працэс, каб яны самі знаходзілі рашэнне. Аднак я лепш патрачу час, каб навучыць іх рабіць самастойна, чым пасля буду ўсё цягнуць на сабе.

## КАЛІ БУДЗЕ ЧАЦВЁРТЫ — З'ЯВІЦЦА І ПЯТЫ

Матуля даволі часта прыходзіць дадому позна, таму ўсе паспяваюць адно па адным засумаваць. Марыя кажа, што да яе вяртання дома ўжо ўсё зроблена, а дзеці чакаюць, што час мамы будзе толькі для іх, а не на хатнія клопаты.

— Малодшая, 6-гадовая Настасся, самая самастойная і адказная, ёй можна даручыць усё. Пакуль я на сваёй трэніроўцы, яна танцамі займаецца ў суседнім пад'ездзе: сама адзенецца на заняткі і збярэ рэчы пасля, прыйдзе і яшчэ мяне чакае. Такая ж упартая і мэтанакіраваная, як і я, і займаецца ў мяне тайскім боксам.

Старэйшы з дзяцей, Эдзік, у свае 13 гадоў вельмі смачна гатуе, як, дарэчы, і тата. І заўжды стараецца парадаваць маму сняданкамі. Ён займаецца самба. 9-гадовая Лера захапляецца танцамі і ўжо мае прызавыя месцы. Яна сапраўдная дзяўчынка, упэўнена мама і проста зачароўваецца літаратурнай мовай сваёй сярэдненькай.

— Калі Бог дасць яшчэ дзіця, то не адмовімся, аднак мэтанакіравана не плануем. Але ж калі будзе чацвёртае, то, упэўнена, і пятае будзе.

## ТЫ ПАСПРАБУЙ — ТАБЕ НЕ СПАДАБАЕЦЦА

Сваю першую ўзнагароду — медаль — званне заслужанага майстра спорту Марыя, дарэчы, атрымала сёлета. А ўпершыню ў секцыю тайскага боксу дзяўчына прыйшла 13 верасня 1999 года і засталася ў ім больш як на 20 гадоў. Да гэтага яна займалася воднымі лыжамі, цяжкай атлетыкай, каратэ, танцамі, хадзіла нават у цыркавую студыю. Аднак нідзе не знаходзіла блізкай сабе энергетыкі і кантакту, пакуль не сустрэла свайго першага трэнера Пятра Пятровіча, пра якога ёй расказаў аднакласнік Мікіта.

— Ён у той год пачаў займацца тайскім боксам і ўсё расказваў мне, як гэта крута, і што яны там рабілі, і які там класны трэнер. 13 верасня я не вытрывала і сказала: «Сёння ідзём разам», — расказвае, як трапіла ў свой спорт Марыя. — Я была ў секцыі адзіная дзяўчынка. Першы раз прыйшла з грашыма, каб запісацца, а трэнер паглядзеў на мяне і кажа: «Ты паспрабуй, табе не спадабаецца, не расходвай грошы». А я засталася, і трэнер стаў для мяне другім бацькам. Яго дагэтуль на ўсіх спаборніцтвах упісваю ў спецыяльную картку першым трэнерам, а цяперашняга — другім. Не прайшло і года, як паехала на чэмпіянат свету па кікбоксінгу ў Алушту, дзе ўзяла «срэбра». Тады я і задумалася зай-



мацца ўсур'ёз гэтай справай і далей. Цяпер я той фінальны бой з украінкай пераглядаю і думаю, што там можна было паспрачацца і за першынство.

## РУЖОВЫЯ ПАЛЬЧАТКІ І 20 КІЛАГРАМАЎ ЗА 1,5 МЕСЯЦА

У 2004-м на Чэмпіянаце свету ў Чыангмаі (Тайланд) яна заняла трэцяе месца. Стоячы на п'едэстале, Марыя вырашыла, што больш не будзе на гэтай прыступцы, чаго б ёй гэта ні каштавала. І ўжо на наступны год яна выйграла чэмпіянат свету. Яшчэ праз год саступіла сваю вагавую катэгорыю дзяўчыне з каманды і пайшла ў большую вагавую катэгорыю, дзе ўсё адно перамагла. Потым правяла адзін бой за званне чэмпіёнкі свету сярод прафесіяналаў і... зацяжарыла на піку спартыўнай кар'еры.

— Я была такая шчаслівая, — свецціца ад прыемных успамінаў мая суразмоўніца. — А праз год ужо вярнулася да трэніровак. Эдзік спаў, а я займалася. Цяпер на ўласныя трэніроўкі не так шмат часу. А яшчэ было цяжка аднаўляцца пасля трэціх родаў: я тады набрала шмат вагі. А чэмпіянат свету праходзіў якраз у Мінску, і мне прыйшлося за 1,5 месяца сагнаць больш як 20 кілаграмаў. Гэта была перамога над сабой, я нават не ведала, што так магу. Але ж самае крыўднае было, што, нягледзячы на ўсе высілкі, мяне ў фінале засудзілі. Я так разззлавалася, што парвала свой спартыўны пашпарт, раздала ўсю экіпіроўку і думала, што больш не вярнуся ў спорт. Мой цяперашні трэнер вярнуў мяне хітрыкамі. Ён пазваніў і сказаў: «Я прывёз табе ружовыя пальчаткі, забяры, гэта цябе не абавязвае ні да чога». Вядома, я вярнулася.

Сёлета чэмпіёнка ўжо выйграла два рэспубліканскія спаборніцтвы па тайскім боксе і па кікбоксінгу за права ўдзельнічаць у чэмпіянаце свету, які адбудзецца ў снежні. Марыя з сумам кажа, што гэта будуць, пэўна, ужо апошнія яе прафесійныя спаборніцтвы, хоць выступаць яна можа да 40, а пакуль ёй толькі 35. Па-першае, вельмі цяжка арганізоўваць падрыхтоўку да чэмпіянатаў, стамляешся маральна і не паспяваеш аднаўляць энергію. Трэніроўкі падчас працоўнага водпуску — гэта ж не адпачынак. Па-другое, больш складанай становіцца і канкурэнцыя.

Спартсменка трэніруе дзяўчынак. Прычым адна з яе падапечных таксама прайшла адбор на чэмпіянат свету ў Тайландзе, і яны паедуць выступаць разам. Марыя вельмі спадзяецца, што яны вернуцца з двума залатымі медалямі, і для яе гэта стане прыгожым сыходам са спорту.

## ЛЮДЗІ ХЛУСЯЦЬ, ДОКАЗЫ — НЕ

Марыя Белуш скончыла Акадэмію МУС. Трапіць сюды жаночай палове даволі цяжка, таму дзяўчыне, якая нарадзілася ў Наваполацку, прыйшлося пастарацца.

— Сяброўка маёй бабулі — палкоўнік міліцыі ў адстаўцы. Калі яна прыходзіла да нас у госці, расказвала цікавыя гісторыі, як яна расследавала розныя справы. І я зразумела, што гэта маё, я абавязкова павінна стаць міліцыянерам, — успамінае Марыя. — У мяне абвостранае пачуццё справядлівасці, праз што я і дагэтуль пакутую. Ужо з дзявятага класа я пачала грунтоўна вывучаць прадметы, патрэбныя для экзаменаў у акадэмію.

Да таго ж трэба было атрымаць рэкамендацыі і прайсці ўрачэбна-ваенную камісію ў Віцебску. Заўзятая спартсменка была ўпэўнена, што са здароўем ніякіх праблем не будзе. Аднак на прыёме ў вышэйшага міліцэйскага начальства свайго рэгіёна, каб атрымаць накіраванне на паступленне, прыйшлося праявіць настойлівасць, каб атрымаць патрэбную паперу.

«І што, што я не выдатніца? Затое я чэмпіёнка свету па тайскім боксе», — заявіла яна ў адказ на заяву, што «толькі дзяўчынкі-выдатніцы могуць спрабаваць паступаць у акадэмію».

Марыя кажа, што на рабоце яе акружаюць людзі, якія энергетычна ёй пасуюць, а яшчэ — праца раснастайная. Яна можа выступаць як экспертам, так і спецыялістам.

— Калі я выязджаю на нейкае здарэнне, я аўтаматычна станаўлюся там спецыялістам, — усміхаецца Марыя. — Я першы чалавек, які ступае на месца злачынства і чыя задача — знайсці следавую інфармацыю, каб аднавіць сапраўдную карціну таго, што адбылося. Людзі хлусяць, каб абяліць сябе, а доказы — не.

## ЗУБЫ, ПАЛЬЦЫ, ГОЛАС...

Доказам можа быць амаль што заўгодна, бо бясследна чалавек не можа існаваць нідзе. Захоўваюцца сляды розны час у залежнасці ад абставін: тэмпературы, вільготнасці паветра... Адбіткі пальцаў могуць і гадамі існаваць, калі рукі былі тлустымі, кажа судовы эксперт:

— Аднойчы злачынца дакрануўся да дзвярэй вухам, каб паслухаць, ці ёсць хто дома. Спецыяліст забраў гэты адбітак, і па ім, калі злодзея затрымалі, даказалі вінаватасць у крадзяжах. У пэўнай меры мая работа творчая, бо мне трэба падумаць, як знайсці спосаб устанавіць, напрыклад, што менавіта гэтай пілой спілавалі тое дрэва. І пры гэтым памятаць, што ад вашых высноў залежыць нечы лёс. Памятаю, выехала я на крадзеж веласіпеда з бальніцы, дзе штодня мноства людзей, знайшла адбітак далоні на дзвярах іншага выхада з тамбура, які праверылі па базе і ўстанавілі асобу злачынцы. Так што веласіпед вярнулі.

Бадай, штодня яна скрупулёзна вывучае дзясяткі і сотні дробных кавалачкаў, каб убачыць толькі адну цэлую карцінку. А нядаўна ў справе па наркотыках за тыдзень прыйшлося разгледзець 6000 аб'ектаў.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# ПАСПЫТАЕМ КАВУНЫ?

## Адкуль яны прыехалі і колькі зараз каштуюць

**Чым падтрымліваць сілы ў гэтую неверагодную, нязвыклую для нашых шырот спякоту, калі зусім нічога не хочацца? Менавіта для такіх гарачых дзён і існуюць кавуны!**

Невыпадкова радзімай гэтай гіганцкай ягады лічыцца трапічная Афрыка (дзікія кавуны і сёння растуць на мяжы пустыні Калахары). «Прыручылі» кавун тысячы гадоў таму — яго акультурылі старажытныя егіпцяне. У самых старажытных мовах ужо ёсць слова для яго абазначэння. Заходняя Еўропа пакаштавала кавун амаль дзве тысячы гадоў таму, а вось нашы людзі — толькі ў XVII стагоддзі.

Вядома, што кавун складаецца на 80 працэнтаў (некаторыя гатункі — на 95 працэнтаў) з вады. Гэта мае прыроднае мачагоннае дапаможа справіцца з цяжкай інтаксікацыяй любой этыялогіі (напрыклад, з сімптомамі пахмелля). Дэтаксікацыйныя ўласцівасці кавуна звязаны з актыўнай адсорбцыяй клятчаткай таксінаў у кішэчніку. Вітамінна-мікраэлементны комплекс, што змяшчаецца ў кавунах, дапамагае метабалізму печані, кавуны — частка лячэбнай дыеты пры мочакаменнай хваробе і прафілактыка камянёў у жоўцевым пузыры. Гэты плод змяшчае велізарную колькасць жалеза, таму кавун рэкамендуюць дзецям пры нізкім гемаглабіне ў крыві. Есці кавун вельмі карысна маладым маці, што кормяць дзіця грудзьмі. Ну, а дыетолагі рэкамендуюць кавуновыя разгрузачныя дні.

### «НЕ СПАДАБАЕЦЦА — НЕ ВОЗЬМЕЦЕ...»

Яшчэ гадоў 10 таму кавуны ў нашых шыротах былі сезонным ласункам — з'яўляліся ў продажы ў жніўні, заканчваліся восенню. Цяпер кавуны ў буйных гіпермаркетах прадаюцца круглы год, а кавуновы сезон на рынку пачынаецца разам з летам.

Зараз на Камароўцы пад кавуны адведзены цэлыя гандлёвыя рады — побач з прадаўцамі ўзвышаюцца горы паласатых «мячыкаў», што хаваюць унутры халаднаватую салодкую мякаць.

— Месяц таму кавуны былі іранскія, цяпер ужо ў асноўным гандлююць кавунамі з Казахстана. А потым будзем ужо расійскія прадаваць, — кажа прадаўшчыца Вольга.

— Раней сярэдзіны лета кавуны дакладна купляць не варта: адны нітраты, — мяркуе пакупніца.

— Вось тут вы не маеце рацыю. Іранскія кавуны, якія ў пачатку лета прадавалі, на мой смак, былі самыя смачныя. І казахскія таксама сакавітыя і салодкія. І ўжо не так дорага, як было ў пачатку лета, і з пункту гледжання смаку — гарантую, застанецеся задаволеныя.

— Пакупнікі сярэдняга ўзросту асцерагаюцца купляць кавуны зараз, у іх стэрэатып: толькі ў жніўні, — тлумачыць Вольга. — Але цяпер кавуны вязуць да нас з многіх краін, дзе яны паспяваюць у розныя тэрміны.

Цэны на кавуны ўсё яшчэ не сказаць, каб нізкія: 3,50 за кілаграм. Невялікі кавун важыць каля 8 кг, і каштаваць будзе, адпаведна, каля 30 рублёў. А вялікі — і зусім стане ў капеечку.

Кавуны, у асноўным, на рынку цяпер буйныя. Можа быць, таму прадаюць іх у асноўным мужчыны, жанчын на кавунах значна менш.

— Магу выбраць на 8—10, і на 15, і на 20 кілаграм. Кавуны — супер! Надрэжу, паспрабуеце, не спадабаецца — не возьмеце. Калі дорага, вазьміце палову, толькі разрэзалі. Ці вось, чвэртачку, — прапануюць пакупнікам.

Палоўкі і чвэртачкі спакаваныя ў харчовую плёнку. І ўсё ж такая эканомія можа абярнуцца бядой, сцвярджаюць медыкі. Сакавітая салодкая мякаць кавуна — ідэальнае асяроддзе для размнажэння бактэрый, якія трапляюць у разрэзаны плод з пылам, з нажа і з паветра. Як вынік, можна атрымаць сур'ёзнае харчовае атручэнне. Па гэтай жа прычыне не варта набываць цэлыя кавуны з расколінамі, увагнутасцямі і нават вельмі маленькімі падгнілымі ўчасткамі.



І ўсё ж разрэзаны кавун можа быць карысны асцярожнаму пакупніку — у якасці «ілюстрацыйнага матэрыялу». Справа ў тым, што кавуны лёгка назапашваюць хімікаты, якія выкарыстоўваліся падчас іх вырошчвання. Уважліва ўглядзецеся ў разрэзаны кавун, які выстаўляюць на вітрыне прадаўцы. Лішак нітратаў праявіць сябе ўшчыльненнямі ў мякаці.

На адным з прылаўкаў з гарой кавуноў чытаем: «Дастаўка да машыны бясплатна». Канкурэнцыя высокая, і многія прадаўцы робяць маркетынгавыя крокі. Дзякуючы спякоце, багаццю кавуноў і дыняў, вялікай колькасці ўсходніх мужчын за прылаўкамі і прызыўным выкрыкам прадаўцоў («Купі кавун, дарагі!») мінская Камароўка ў гэтыя дні набыла каларыт усходняга базару.

— Прыгожым дзяўчатам зніжка: па тры рублі палічу, — шырока ўсміхаецца прадавец каўказскай знешнасці. — Цукровы, салодкі кавун з Азербайджана.

— А які гэта гатунак?

— Сабірабадскі, — скорагаворкай.

— Які-які? — пытаемся хорам з яшчэ адной пакупніцай, што таксама палічыла сябе досыць прыгожай для зніжкі.

— У Азербайджане ёсць Сабірабадскі раён, — цярпліва тлумачыць някемлівым прадавец. — А гэта сабірабадскі кавун, самы смачны кавун на рынку.

— Тут усходы самы смачныя, — смяецца пакупніца.

Скурка кавуноў, якімі гандлююць на Камароўцы цяпер, святлейшая, чым у больш позніх гатункаў, да якіх мы прывыклі. Большасць з прадаўцоў не могуць назваць гатунак кавуноў, якімі гандлююць. Але ёсць і выключэнні.




— У мяне кавуны ўзбекскія, — кажа хлопец за прылаўкам. — А гатунак — «Амерыканка», сярэднеранні.

— Я толькі «Халадок» ведаю...

— «Халадок» будзе пазней, у канцы лета — у жніўні, як мы і прывыклі. Напэўна, гэта самы вядомы і самы любімы пакупнікамі гатунак, — кажа прадавец. — Ён выдатна захоўваецца (калі правільна захоўваць — нават да снежня) і пры гэтым не губляе сакавітасці. Але і «Амерыканка» — таксама вельмі смачны кавун: мала костачак, мякаць шчыльная, сакавіты і вельмі салодкі. Але захоўваць яго не варта, ешце адразу!

### ПРА «ХВОСЦІКІ» І «ШЧОЧКІ»

Саспелы кавун — найкаштоўнейшы харчовы прадукт. Ён салодкі на смак і пры гэтым змяшчае не так шмат цукру (амаль у тры разы менш, чым салодкія гатункі дыні), вітаміны A, B і C. Бялкоў у кавуне вельмі мала, менш за адзін працэнт, затое яны вельмі каштоўныя: утрымліваюць незаменныя ў харчаванні чалавека амінакіслоты. Прысутнічаюць у кавуне і арганічныя кіслоты (цытрынавая, яблычная, бурштынавая), а таксама табліца мікраэлементаў: калій, магній, натрый, жалеза, сера, кальцый.

Але гэта — калі плод сапраўды саспелы і без нітратаў. Спярша разбяромся са спеласцю.

Аб вызначэнні прыкмет спеласці кавуна без яго надразання можна пісаць навуковую дысертацыю — прыкмет існуе мноства. І ні адна, узятая ў асобнасці, не дае стапрацэнтнай гарантыі.

— Спелыя плады становяцца глянцавымі (скурка няспелых матавая), — кажа прадавец Мансур. Ён тлумачыць, што ў саспелых кавуноў малюнак кары больш выразны, чым у недаспелых. Таксама крытэрыем «сталасці» кавуна лічыцца трэск пры моцным сцісканні.

Прадаўцы ахвотна выберуць вам кавун самі. Але калі вызначыць спеласць кавуна на вока вы не можаце, а выбару прадаўцоў не давяраеце, медыкі ўсё ж не раяць надразаць плод пры куплі. На лупіне кавуна могуць быць узбуджальнікі кішэчнай інфекцыі, таму разрэзаць кавун можна, толькі вымыўшы (лепш за ўсё — з мылам або сродкам для мыцця посуду). У адваротным выпадку мікробы пранікнуць у мякаць, і паўстане сур'ёзная пагроза для здароўя.

— На «шчочку», на «шчочку» глядзіце, — раіць прадавец Тамара.

«Шчочкай» прадаўцы называюць светленькую плямку на баку ў кавуна, на якой плод ляжаў пры паспяванні на бахчы. Гэты ўчастак быў схаваны ад сонца, таму ён інакш афарбаваны. «Шчочка» павінна быць жоўценькай, а не белай: чым яна цямнейшая, тым спялейшы кавун. Калі гэта плямка вялікая, кавун спеў пры недахопе сонца — ён будзе недастаткова салодкім, «як вада».

— Ну, а калі стукаць? Або сціскаць? Што менавіта мы павінны пачуць? — у многіх нашых суайчыннікаў пазнанні аб выбары саспелага кавуна запазычаныя з мультфільма «Ну, пачакай!».

— Стукаць і сціскаць ёсць сэнс, калі вы ведаеце, як павінен «гучаць» кавун, — усміхаецца Тамара. — Саспелы сакавіты кавун сапраўды пры пастукванні выдае звонкі і гулкі гук, а калі кавун не саспелы, гук будзе глухі. Але каб пачуць гэта, патрэбна ўсё ж некаторая практыка. Тым больш тут таксама ёсць свае нюансы: напрыклад, глухі гук пры пастукванні кавуна пальцамі можа выдаваць і даспелы кавун ранніх гатункаў. Можна, дарэчы, выбіраць па скурцы — асабіста я заўсёды бяру кавун з вялікай адлегласцю паміж палосамі: ён будзе салодкі.

— Яшчэ «хвосцік» павінен быць сухі? — успамінаю народную прыкмету.

— Так, па «хвосціку» можна вызначыць спеласць кавуна, але трэба глядзець толькі на кончык: ці быў плод зрэзаны або яго адламалі. Калі зрэз няроўны — плод даспяваў на бахчы, а не ў кузаве фуры.

Яшчэ адзін пакупніцкі міф — што ў пладоў кавуна ёсць пол: «дзяўчынкі» саладзейшыя за «хлопчыкаў». Ці праўда гэта і ці мае якія-небудзь адносіны да батанікі, прадаўцы не ведаюць. Сапраўды, у кавуна фарміруюцца кветкі розных тыпаў. Мужчынскія кветкі размяшчаюцца на расліне бліжка да семядольных лісцікаў, жаночыя раўнамерна размяркоўваюцца па ўсёй даўжыні плеці. У прадаўцоў «дзяўчынкамі» лічацца плады, у якіх плямка там, дзе была кветка, плоская і большая, а «хлопчыкамі» — плады з плямкай меншай і больш выпуклай.

— Калі хочаце салодкі кавун, бярыце «дзяўчынку,» — раіць Тамара.

### ...І ПРА НІТРАТЫ

Угнойваючы бахчу азотам з перавышэннем нормы, цалкам рэальна вырасціць плод вагой каля 10 кг усяго за 20 дзён. Але такім плодам можна атруціцца.

Не варта купляць кавун, калі на лупіне ёсць праколы. Цалкам магчыма, гэта сляды ад іголак.

— Калі «дзірачкі» не дасягаюць мякаці — гэта сляды, якія пакінулі насякомыя. Яны, наадварот, кажуць аб экалагічнасці кавуна, — сцвярджае прадавец Тамара. — Тое ж самае датычыцца бэжавых, шэрых або залацістых «шрамаў» на скурцы. Гэта пчолы хацелі дабрацца да мякаці. Але такіх кавуноў на «Камароўцы» вы не знойдзеце: пакупнік зараз прыдзірлівы.

Патрымайце ў руках кавун перад набыццём — ён павінен быць цяжкім, важкім. Калі плод вялікі, але лёгкі — нешта тут не так.

Каб не з'есці нітратны кавун, разразаем яго дома і глядзім на колер унутранага зрэзу лупіны. Калі яна жоўтая, а не белая — кавун лепш не есці. Бачым пражылкі ў мякаці (белыя або жоўтыя) — тое ж самае. Калі ў мякаці разрэзанага кавуна мы бачым пустыя поласці, гэты плод вырошчвалі пры дапамозе гармонаў росту.

Народны спосаб праверыць кавун на ўтрыманне нітратаў — змясціць лустачку мякаці ў чыстую халаднаватую ваду. Калі вада афарбуецца ў насычана-ружовы, такі кавун ужываць не варта.

Ядуць кавун звычайна ў свежым выглядзе. Але калі ёсць час і хочацца чагосьці гэтакага, можна з кавуна што-небудзь прыгатаваць. Напрыклад, бекмез (кавуновы мёд). Кавуны мыем, рэжам на дзве ці чатыры часткі. Мякаць здабываем сталовай лыжкай і здрабняем драўляным таўкачыкам, пасля чаго працэджваем праз сіта і працэджваем праз марлю. Варыць мякаць трэба, пастаянна памешваючы і здымаючы пену. Гатоўнасць мёду правяраецца так: астуджаная кроплі бекмезу практычна не расплываюцца, захоўваючы форму на талерцы.

Ну, або летняя салата: бяром вялікую лусту кавуна, пучок салаты, 200 г нятлустай вяндліны, зялёны яблык, сок аднаго буйнога лімона, 8 лісточкаў мяты, пяць сталовых лыжак аліўкавага алею, соль і перац на смак. Рэжам салату адвольна, вяндліну — саломкай, яблык — долькамі, кавун — кубікамі. Для падліўкі змешваем сок паловы лімона, аліўкавы алей, перац, соль. Паліваем салату запраўкай, змешваем і ўпрыгожваем лісцікамі мяты.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению УП «Випра» (продавец имущества) в лице управляющего в деле о банкротстве – ИП Яцына И.В. извещает о проведении 29 июля 2021 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 20 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **Условие продажи:** Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **Местонахождение лотов:** г. Гомель, Троллейбусный проезд, 4 | | | | |
| **1** | Автомат отрезной круглопильный 85663-100 (инв. № 822) | **4 880,00** | 244,00 | 488,00 |
| **2** | Автомат токарно-револьверный одношипный (инв. № 881) | **3 040,00** | 152,00 | 304,00 |
| **3** | Автомат токарно-револьверный 1Д112 (инв. № 766) | **2 800,00** | 140,00 | 280,00 |
| **4** | Зубофрезерный горизонтальный станок 5303В (инв. № 796) | **1 680,00** | 84,00 | 168,00 |
| **5** | Зубофрезерный станок 53В05ПВ (инв. № 917) | **2 080,00** | 104,00 | 208,00 |
| **6** | Зубофрезерный автомат 53В05ПВ (инв. № 846) | **1 760,00** | 88,00 | 176,00 |
| **7** | Зубофрезерный автомат 53В05ПВ (инв. № 847) | **2 080,00** | 104,00 | 208,00 |
| **8** | Зубофрезерный станок 530П (инв. № 781) | **712,00** | 35,60 | 71,20 |
| **9** | Пресс КД 2126 (инв. № 779) | **4 480,00** | 224,00 | 448,00 |
| **10** | Пресс КД 2128 зав. № 1188 (инв. № 772) | **6 960,00** | 348,00 | 696,00 |
| **11** | Пресс однокривошипный КБ 2326 (782) (инв. № 505) | **2 720,00** | 136,00 | 272,00 |
| **12** | Пресс однокривошипный КД 2126 (1656) (инв. № 762) | **3 600,00** | 180,00 | 360,00 |
| **13** | Пресс однокривошипный КД 2126 (1661) (инв. № 763) | **3 600,00** | 180,00 | 360,00 |
| **14** | Станок токарный полуавтомат1Б240П6 (инв. № 4783) | **9 120,00** | 456,00 | 912,00 |
| **15** | Токарный автомат 1Б10В (4210-86) (инв. № 819) | **1 920,00** | 96,00 | 192,00 |
| **16** | Специальный сверлильный станок 2520-056 (гориз.) (инв. № 920) | **3 040,00** | 152,00 | 304,00 |
| **17** | Настольно-сверлильный станок (инв. № 258) | **880,00** | 44,00 | 88,00 |
| **18** | Молот ковочный пневматический 4134А (880) (инв. № 750) | **10 480,00** | 524,00 | 1 048,00 |
| **19** | Машина швейная SirubaF007J-W122-356/FHA (инв. № 4762) | **1 360,00** | 68,00 | 136,00 |
| **20** | Машина швейная Siruba F 007J-W122-3 (инв. № 4792) | **1 360,00** | 68,00 | 136,00 |
| **21** | Машина швейная Siruba T828 (инв. № 4785) | **1 440,00** | 72,00 | 144,00 |
| **22** | Парогенератор Comel Pratica (инв. № 4812) | **560,00** | 28,00 | 56,00 |
| **23** | Токарно-винторезный станок 1К-62 (инв. № 31) | **3 040,00** | 152,00 | 304,00 |
| **24** | Пресс однокривошипный КД 2320 (инв. № 212) | **1 440,00** | 72,00 | 144,00 |
| **25** | Круглошлифовальный бесцентровой универсальный станок 3М182 (инв. № 360) | **4 320,00** | 216,00 | 432,00 |
| **26** | Плоскошлифовальный универсальный станок 3Г71М (инв. № 430) | **3 520,00** | 176,00 | 352,00 |
| **27** | Переносной парогенератор 1,5 л. (инв. № 1051) | **160,00** | 8,00 | 16,00 |
| **29** | Машина швейная стачивающая-обметочная (инв. № 993) | **240,00** | 12,00 | 24,00 |

**Продавец:** Унитарное предприятие «Випра», г. Гомель, Троллейбусный проезд, 4.

**Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (029) 653-92-88 управляющий в деле о банкротстве – ИП Яцына Игорь Валерьевич. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца имущества (УП «ВИПРА»):** р/с BY11 BLBB 3012 0400 0585 7800 1007 в дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области , БИК BLBBBY2X,УНП 400058578, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 19 июля 2021 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 27 июля 2021 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов). Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником**, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», ст. 127–129.

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 18.03.2021 г. № 50 (29419).**

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by раздел «Аукционы» или www.gomeloblreklama.by, www.bankrot.gov.by.**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Частного производственно-торгового унитарного предприятия «ЧечерскБиоГран» (продавец) извещает о проведении 27 июля 2021 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 10 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Дисковый углопильный станок «Корвет» P15D560,** состояние неудовлетворительное, 2015 года выпуска. Местоположение: г. Чечерск, ул. Советская, 64 | **3 780,00** | 378,00 |

**Продавец:** Частное производственно-торговое унитарное предприятие «ЧечерскБиоГран», 247152, г. Чечерск, ул. Советская, 36. Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактным тел.: 8 (029) 676-48-95 Грушевский Михаил Михайлович (осмотр техники), 8 (029) 316-29-86 Колесникова Татьяна Михайловна (заключение договора купли-продажи).

**Шаг аукционных торгов – 5 (пять)% от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления)**.

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 16 июля 2021 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 23 июля 2021 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения.

**В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно срокам договора купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с «Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденное постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в ред. постановления Совмина от 12.07.2013 № 607).

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 08.06.2021 г. № 106 (29475). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Гипроживмаш» (продавец) извещает о проведении 29 июля 2021 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 60 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Изолированное помещение с инв. № 350/D-187461**, **площадью 256,4 кв. м**, назначение – административное помещение, наименование – **административное помещение.** **Адрес:** г. Гомель, ул. Барыкина, д. 230-1 | **88 800,00** | 4 440,00 |

**Продавец:** ОАО «Гипроживмаш», г. Гомель, ул. Малайчука, 12.

**Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (0232) 53-27-08 – Лодня Татьяна Витальевна. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо: 1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления)**.

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 16 июля 2021 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 27 июля 2021 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором торгов** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола, а также затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **15 (пятнадцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в срок согласно договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 16.04.2021 г. № 71 (29440). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: (тел./факс) 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Калинковичский завод железобетонных изделий» (продавец имущества) извещает о проведении 17 августа 2021 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Адрес:** г. Калинковичи, ул. Подольская, 2 | | | |
| 1 | Узлы и агрегаты автомобиля ИЖ 2717-30, 2004 г. в., объем двигателя 1,6, бензин, техпаспорт отсутствует | **1 600,00** | 320,00 |
| 2 | Узлы и агрегаты автомобиля VAZ 21043, 2005 г. в., объем двигателя 1,6, бензин, техпаспорт отсутствует | **900,00** | 180,00 |
| 3 | Узлы и агрегаты автомобиля ПАЗ 3205, 1998 г. в., объем двигателя 4,6, бензин | **2 400,00** | 480,00 |

**Продавец:** ОАО «Калинковичский завод железобетонных изделий», 247710, г. Калинковичи, ул. Подольская, 2.

**Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактным тел.:** 8 (29) 697-25-59 Свириденко Михаил Васильевич, 8 (029) 125-12-84, 8 (029) 332-43-49 Дулуб Сергей Сергеевич (осмотр техники), 8 (029) 739-52-98 Демедков Виктор Михайлович (заключение договора купли-продажи). **Шаг аукционных торгов – 5 %.**

**Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Калинковичский завод железобетонных изделий»):** р/с BY06 BLBB 3012 0400 0554 2000 1003 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, УНП 400055420, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 16 июля 2021 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 13 июля 2021 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения.**

**Для участия в аукционе представляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

**В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %.**

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: произвести оплату услуг (вознаграждение) за организацию и проведение торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно срокам договора купли-продажи до **30 (тридцати) календарных дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62.**

# Мясцовае самакіраванне

16 ліпеня 2021 г. № 27 (612)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


НАПЯРЭДАДНІ СВЯТА

# ДЗЕЛЯ МІРУ І ЗГОДЫ Ў ГРАМАДСТВЕ

## Адмысловую экспазіцыю, прысвечаную Году народнага адзінства, рыхтуюць у Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь












**З ёй днямі азнаёміўся старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ.**

Падчас візіту сенатару прадэманстравалі старажытныя тэхналогіі вырабу паперы і друку, работу з малодшымі школьнікамі на занятках па археалагічных даследаваннях у краіне. На думку Віктара Лісковіча, наведваючы Нацыянальны гістарычны музей, заўсёды акунаешся ў мінулае і гісторыю краіны, без якой няма будучыні.

— І калі знаходзішся тут, пераконваешся ў гэтым, — падкрэсліў ён. — Вельмі важна захоўваць тое, што было, цаніць мінулае і вучыцца на гэтых ведах. Тады ты фарміруеш свае паводзіны і дзеянні ў цяперашнім часе і перадаеш найлепшае нашчадкам.

Акрамя таго, сенатару прадэманстравалі адмысловую выставу, якую рыхтуюць да Года народнага адзінства. Сюды ўвайшлі ўнікальныя экспанаты як з архіва музея, так і прыватнай калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава. Тут аб'яднаны гістарычныя дакументы, архіўныя матэрыялы і экспанаты ўжо нашых часоў, якія сведчаць аб нацыянальным, рэлігійным і духоўным адзінстве жыхароў нашай краіны. Падчас наведвання экспазіцыі можна пераканацца, што мы заўсёды былі і застанёмся разам, бо мы — нацыя, мы — жыхары краіны, якая завецца Беларуссю.

— Сёлета 17 верасня мы будзем адзначаць Дзень народнага адзінства, і гэта не проста чарговая дата, — падкрэсліў у гутарцы з журналістамі старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі. — Гэта свята, якое павінна служыць для таго, каб мы жылі ў міры і згодзе і дапамагалі адно аднаму, пачынаючы ад сваякоў, суседзяў і заканчваючы ўсім грамадствам, каб наша краіна была адзіным цэлым.

Віктар Лісковіч нагадаў, што ў міры і згодзе людзі жылі тут і сто гадоў таму.

— Ёсць цудоўнае выданне — «Шматнацыянальная Беларусь», якое пабачыла свет напярэдадні Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур два гады таму. У гэтай кнізе дакладна адлюстравана, як жылі нашы продкі, як прагнулі зрабіць жыццё лепшым і, самае галоўнае, кожнае пакаленне імкнулася захаваць мір, — акцэнтаваў увагу ён. — Будзе мір — будзе ўсё. Бо вайна — гэта разбуральнік, гора, боль, смерць, пазітыву людзям не прыносіць. Таму летась мы чарговы раз паказалі, што мы адзіныя і адстаялі сваю незалежнасць. Прэзідэнт нашай краіны Аляксандр Лукашэнка сваім прыкладам аб'яднаў людзей вакол сябе. Мы павінны таксама паступаць такім чынам, каб нашы будучыя пакаленні бачылі поспехі нашай краіны і мірнае неба.

Падчас абмеркавання планаў з кіраўніцтвам Нацыянальнага гістарычнага музея было вырашана зрабіць перасоўныя экспазіцыі ва ўсіх абласных цэнтрах, а асноўную — у Мінску — з адначасовай анлайн-прэзентацыяй 17 верасня.

Дарэчы, анонс гэтага маштабнага праекта, які ахопіць усе рэгіёны, запланавалі зрабіць на Дні беларускага пісьменства ў Капылі, які сёлета адбудзецца 4—5 верасня.

**Вольга АНУФРЫЕВА,
фота аўтара.**

ДЗЕНЬ ЗА ДНЁМ

## На карысць народаў дзвюх краін

**Наталля КАЧАНАВА павіншавала старшыню Сената Французскай Рэспублікі з нацыянальным святам.**

Ад імя Савета Рэспублікі яго спікер павіншавала свайго французскага калегу Жэрара Ларшэ і парламентарыяў гэтай краіны з нацыянальным святам Французскай Рэспублікі — Днём узяцця Бастыліі.

— Упэўнена, што адносіны дружбы і даверу, якія склаліся паміж заканадаўчымі органамі Беларусі і Францыі, будуць і ў далейшым садзейнічаць развіццю і ўмацаванню доўгатэрміновага ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва, а таксама напаўненню яго новым зместам на карысць народаў нашых краін, — цытуе тэкст віншавання прэс-служба верхняй палаты парламента.

## Развіццё рэгіёнаў праз стварэнне інавацыйных вытворчасцяў — правільная стратэгія

**Такую думку выказала старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ падчас наведвання Мёрскага металапракатнага завода, дзе ўзяла ўдзел у абмеркаванні актуальных пытанняў яго дзейнасці, паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента.**

На думку сенатара, ключавы прыярытэт для эканомікі нашай краіны — устойлівае развіццё рэгіёнаў. Сёння адным з найважнейшых інструментаў рэгіянальнай палітыкі з'яўляецца стварэнне рабочых месцаў, прычым высокапрадукцыйных і эфектыўных. Менавіта новыя вытворчасці з дастойнымі ўзроўнем заработнай платы і ўмовамі працы змогуць у перспектыве стаць цэнтрамі прыцягнення рабочай сілы, нададуць імпульс фарміраванню сацыяльнай інфраструктуры ў рэгіёнах.

Таму Савет Рэспублікі надае асаблівае значэнне зваротам працоўных калектываў. Адзін з такіх зваротаў паступіў з Мёрскага раёна Віцебскай вобласці, дзе ў 2020 годзе быў уведзены ў эксплуатацыю металапракатны завод. Варта адзначыць, што яго будаўніцтва — гэта прыватная ініцыятыва, рэалізаваная пераважна за кошт замежных крэдытных рэсурсаў.

Новы завод у Мёрах — унікальная вытворчасць, якая арыентавана на выпуск інавацыйнай прадукцыі, а значыць, мае вялікі экспартны патэнцыял. Відавочна, што на такіх прадпрыемствах могуць узнікаць праблемныя пытанні, бо вытворчая, фінансавая, збытавая мадэлі толькі фарміруюцца. Задача парламентарыяў, у тым ліку ў рамках работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, — з прыцягненнем профільных дзяржаўных органаў, кампетэнтных арганізацый, мясцовай улады дапамагчы пашырыць вузкія месцы на новай вытворчасці, падтрымаць калектыў.

З пункту гледжання парламентарыя, такія інавацыйныя прадпрыемствы, як Мёрскі завод, павінны ствараецца ва ўсіх рэгіёнах краіны. А для гэтага патрэбныя адпаведныя ўмовы і спрыяльны інвестыцыйны клімат, які, між іншым, зводзіцца не толькі да давання падатковых ільгот і прэферэнцый. Важныя таксама наяўнасць транспартнай і энергетычнай інфраструктуры, кваліфікаваныя кадры, фактар лагістыкі. Таму прыцягненне інвестара пад новыя праекты — задача для ўсёй вертыкалі ўлады. Кіраўнік дзяржавы неадназова абазначаў адпаведныя мэтавыя арыенціры для кіраўніцтва рэгіёнаў, міністэрстваў і ведамстваў.

КАРЫСНЫ ДОСВЕД

# У ІВЯНЦЫ — СМАЧНА

## Як вядомую калісьці кандытарскую прамысловасць вяртаюць да жыцця

**Прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА наведаў Івянецкі філіял ААТ «Кандытарская фабрыка «Слодыч». Там запушчана лінія па вытворчасці малочных, жэлейных, суфлейных і памадных цукерак.**

Новы кірунак мае на мэце павелічэнне аб'ёмаў вытворчасці на кандытарскай фабрыцы і стварэнне новых працоўных месцаў у рэгіёне. Праект важны па вырабе імпартазамяшчальнай прадукцыі, якую ў далейшым плануецца адпраўляць і на экспарт.

«Гэта адзін з дастаткова паспяховых прыкладаў, калі прадпрыемства фактычна са стадыі ліквідацыі пасля банкруцтва атрымлівае новае жыццё, адраджаецца, калі, здавалася б, непатрэбны, непрыдатны актыў


Фота БелТА.

ва ўмелых руках і пры ўдалым збегу абставін ператвараецца ў прыбытковы. У ранейшых уласнікаў з-за розных прычын бізнес не атрымаўся, прадпрыемства не магло абслугоўваць даўгі і сышло ў працэдуру санацыі і наступнай ліквідацыі. Вельмі важна, што прадпрыемства падхапіў больш моцны канкурэнт — «Слодыч» — у адпаведнасці са сваёй стратэгіяй развіцця. У сціснуты адрэзак часу ўдалося не толькі аднавіць вытворчасць, але і дамагчыся досыць уражлівых паказчыкаў. Попыт перавышае вытворчыя магчымасці», — сказаў Раман Галоўчанка.

Прэм'ер-міністр адзначыў, што многае яшчэ трэба будзе зрабіць. «Прадпрыемства доўгі час заставалася без буйных інвестыцый, трэба наводзіць усюды парадак, займацца добраўпарадкаваннем. Але самае галоўнае, што яно атрымала новае жыццё. Для гарадскога пасёлка Івянец і яго жыхароў гэта мае вялікае значэнне, — падкрэсліў ён. — Акрамя таго, у «Слодычы» ёсць намер правесці аналагічную работу з маладзечанскім кандытарскім прадпрыемствам. Мы яшчэ абмяркуем, як выкарыстоўваць гэты вопыт для іншых прадпрыемстваў краіны, якія з-за розных прычын аказаліся не ў лепшым стане. Трэба імі заняцца і ўдыхнуць новае жыццё».

Таксама Раман Галоўчанка правёў рабочую нараду з кіраўніцтвам Мінскага аблвыканкама і Валожынскага райвыканкама.

**Паводле БелТА.**

ВЯРТАЮЧЫСЯ ДА НАДРУКАВАНАГА

# ЗНАКАВЫМ МЯСЦІНАМ — АСАБЛІВУЮ ЎВАГУ

**14 кастрычніка 2020 года ў «Звяздзе» ў артыкуле Вольгі Ануфрыевай «Ці паспеюць з рэканструкцыяй храма на Вайсковых могілках у Мінску да 800-гадовага юбілею святога Аляксандра Неўскага?» расказвалася аб садзейнічанні Савета Рэспублікі, а дакладней, членаў яго Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, рамонту будынка храма і ўвогуле добраўпарадкаванні тэрыторыі могілак.**






Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.










Такая ўвага сенатараў невыпадковая. Па-першае, храм князя Аляксандра Неўскага — у ліку знакавых мясцін Мінска. Гэта адзіны храм сталіцы, які практычна цалкам захаваў сваё першапачатковае аблічча з XIX стагоддзя. Пры савецкай уладзе яго закрывалі ўсяго на тры гады. Але потым, калі іншыя храмы была зачыненыя, царква на Вайсковых могілках працягвала працаваць.

Па другое, у Пастаянную камісію звярнуліся грамадзяне з просьбай дапамагчы з рэканструкцыяй храма. З гэтай нагоды **старшыня камісіі Віктар ЛІСКОВІЧ** на свае вочы разам са спецыялістамі-будаўнікамі ўважліва агледзеў храм, зрабіў пэўныя высновы з той сітуацыі, пастараўся знайсці і, дарэчы, знайшоў сярод дзелавых людзей сталіцы спонсараў, якія неабыякава ставяцца да захавання культурна-гістарычнай спадчыны і гатовыя рэальна дапамагаць у фінансаванні яе адраджэння.

Днямі Віктар Лісковіч зноў наведаў прыход храма князя Аляксандра Неўскага ў Мінску. Сенатар з задавальненнем канстатаваў, што ўжо нямала зроблена за той адносна непрацяглы перыяд пасля яго папярэдняга візіту. Разам з настаяцелем храма протаіерэем Мікалаем Коржычам сенатар зноў уважліва агледзеў могілкі, моўчкі аддаў даніну павагі тут пахаваным знакамітым людзям Беларусі, якія шмат зрабілі для сваёй радзімы.

Потым, падчас сустрэчы старшыні Пастаяннай камісіі з настаяцелем храма, адбылася грунтоўная і прадметная размова, у ходзе якой былі абмеркаваны надзённыя пытанні захавання культурна-гістарычнай спадчыны на прыкладзе рэканструкцыі царквы на Вайсковых могілках. Суразмоўцы засяродзіліся на яшчэ нявырашаных і цяжка пакульвырашальных пытаннях рэканструкцыі храма, актывізацыі ўдзелу ў гэтым як вернікаў, так і мецэнатаў, некаторых гарадскіх грамадскіх і будаўнічых арганізацый, а таксама органаў мясцовай улады сталіцы.

Затым у размове з журналістамі Віктар Лісковіч адзначыў і вялікую важнасць захавання багатай культурна-гістарычнай спадчыны для наступных пакаленняў беларусаў і яе выключнае педагагічнае значэнне ў выхаванні з падлеткаў юных патрыётаў. «Сёння роля духоўнасці і культуры, як асобнага чалавека, так і грамадства ў цэлым, значна ўзрастае. Менавіта культура, як сацыяльны інстытут, здольная забяспечыць грамадскую стабільнасць, кансалідаваць дзяржаву, аб'яднаць і натхніць грамадства на вырашэнне найважнейшых нацыянальных задач. А ўвогуле, наша спадчына — залог стабільнасці і далейшага паспяховага развіцця беларускай дзяржавы», — падкрэсліў Віктар Лісковіч.

**Леанід ТУГАРЫН.**

Слухай сваё

# ДЗЕ ПАЧУЦЬ «СЛАВЯНСКІ БАЗАР» У РАДЫЁЭФІРЫ?

**Прамыя трансляцыі, інтэрв'ю, рэпартажы, усе падрабязнасці закулісся фестывалю прапануюць сваёй аўдыторыі радыёстанцыі Белтэлерадыёкампаніі, якія адкрыюць свае карпункты ў Віцебску.**

Асноўныя падзеі XXX Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» будуць шырока асвятляцца ў эфіры Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё. Тут у інфармацыйных выпусках запланаваны аператыўныя ўключэнні з фестывальных пляцовак, пачуем уражанні замежных гасцей і рэпартажы з культурнага форуму. Прыхільнікі яго могуць сачыць за падзеямі таксама і ў афіцыйных акаўнтах Першага нацыянальнага канала: у сацсетках і месенджары Telegram.

Канал «Культура» ў дні фестывалю прадставіць сваім слухачам уключэнні з канцэртных, тэатральных і выставачных зал, рэпартажы з удзелам гасцей і ўдзельнікаў «Славянскага базару». У праекце для дзяцей і падлеткаў «ДНК» адбудуцца эфірныя сустрэчы з прадстаўнікамі і пераможцам дзіцячага конкурсу «Віцебск-2021», удзельнікамі маладзёжнай праграмы.

Радыёстанцыі «Радыус-FM» і «Сталіца» таксама запрануюць сваёй аўдыторыі рэпартажы, інтэрв'ю з артыстамі, самыя цікавыя навіны і шмат іншага. На дзевяці мовах загучыць XXX Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» ў эфіры Міжнароднага радыё «Беларусь». Акцэнт там зробяць на замежных гасцях і ўдзельніках форуму. Спецыяльны праект «Фестывальны калейдаскоп» будзе знаёміць з навінамі і найбольш знакавымі мерапрыемствамі «Славянскага базару». Варта адзначыць, што фестывальны марафон пройдзе і ў эфіры рэгіянальных радыёстанцый Белтэлерадыёкампаніі «Радыё Брэст», «Горад FM», «Радыё Віцебск», «Радыё Гомель», «Гомель+», «Радыё Гродна», «Радыё Магілёў» ва ўсіх абласцях краіны.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 124

Аўтар сёняшняй задачы — мінскі складальнік Міхаіл Шаблінскі ***(гл. дыяграму)***.



**Белыя:** Крс8, Фb1, Сd4, Кd8, пп. с5, f2 (6).

**Чорныя:** Кре8, Лh8, Ка6, пп. f5, f7, h7 (6).

Мат за 2 хады.

***Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru***

* * *

На міжнародным конкурсе ў гонар 130-гадовага юбілею славутага расійскага шахматнага кампазітара Леаніда Кубеля ганаровы водгук атрымала задача Аляксандра Варыцкага з Брэста.

**Белыя:** Кре1, Лh3, Сс4, Ке3, пg3 (5).

**Чорныя:** Крg1, Сf1, пп. е2, f4, g2, h4 (6).

Мат за 11 хадоў.

Здаецца, да мэты вядзе варыянт 1. Кf5? fg 2. С:е2! С:е2 3. К:h4 Сh5 4. Л:g3 Крh2 5. Крf2 g1Ф+ 6. Л:g1 Крh3 7. Кf5 Сd1 8. Лg3+ Крh2 9. Лg2+ Крh3 10. Крg1 ~ 11. Лg3х, але 1...f3! Таму рашае 1. Кg4! fg 2. Лh2! gh 3. Ке5 Крh1 4. Сd5 h3 5. Са8!! Крg1 6. Кf3+ Крh1 7. Крf2 е1Ф+ 8. К:е1 Се2 9. К:g2 Сf1 10. Кр:f1 hg 11. С:g2х

* * *

Прапануем яшчэ дзве партыі сёлетніх чэмпіянатаў Беларусі.

Арцём Сіняўскі — Кірыл Ступак. 1. е4 с5 2. Кf3 Кс6 3. Сb5 g6 4. С:с6 bс 5. 0-0 Сg7 6. Ле1 Кh6 7. с3 0-0 8. d4 сd 9. сd d5 10. е5 f6 11. Фс2 Фb6 12. b3 fе 13. dе Кg4 14. h3 Л:f3 15. hg Лf7 16. g5 Сf5 17. Фb2 Лаf8 18. Кс3 Се6 19. Ле2 d4 20. Ка4 Фb5 21. Ле1 Л:f2 22. Ф:f2 Л:f2 23. Кр:f2 С:е5 24. Сb2 Сf5 25. Крg1 Фd5 26. Лаd1 с5 27. Кс3 Фd6 28. Кb5 Сh2+ 29. Крh1 Фg3 30. С:d4 Фh4 31. Л:е7 Сd6+ 32. Крg1 Фh2+ 33. Крf1 Фf4+ 34. Сf2 С:е7, 0:1.

Варвара Палякова — Марына Хоміч. 1. Кf3 d5 2. g3 Кf6 3. Сg2 с6 4. d3 Сf5 5. 0-0 е6 6. Кh4 Сg4 7. h3 Сh5 8. Фе1 Сс5 9. е4 dе 10. dе е5 11. Кf5 0-0 12. Кd2 Кbd7 13. Кс4 b5 14. Ксе3 Сg6 15. а4 а6 16. Сd2 С:е3 17. Ф:е3 С:f5 18. еf Кd5 19. Фg5 К7f6 20. Лfd1 Фс7 21. Фh4 Лfd8 22. Крh1 Ке7 23. g4 Кfd5 24. Фg3 Кf4 25. С:f4 еf 26. Фс3 Лас8 27. аb аb 28. Фс5 h6 29. Ле1 Лd7 30. Ле5 Кd5 31. Лае1 Крh7 32. с3 Лсd8 33. Сf3 Фb7 34. Крg2 Лd6 35. h4 Л6d7 36. b3 Лd6 37. с4 bс 38. bс Кb4 39. Лb1 Кd3 40. Л:b7 К:с5 41. Л:с5, 1:0.

* * *

А вось два паядынкі з чарговага анлайн-турніру элітных гросмайстраў свету па хуткіх шахматах.

Уэслі Со — Магнус Карлсен. 1. е4 е5 2. Кf3 Кс6 3. Сс4 Сс5 4. с3 Кf6 5. d3 d6 6. Кbd2 0-0 7. h3 а6 8. Сb3 Се6 9. Сс2 d5 10. Кg5 Сс8 11. еd Ф:d5 12. 0-0 Сf5 13. Кdе4 Се7 14. Фf3 Фd7 15. b4 Лаd8 16. Лd1 Кd5 17. d4 Сg6 18. dе К:е5 19. Фg3 Кс4 20. h4 Фс6 21. Лd4 К:b4 22. Л:d8 К:с2 23. Л:f8+ С:f8 24. Лb1 С:е4 25. К:е4 Ф:е4, 0:1.

Максім Ваш'е-Лаграу — Аніш Гіры. 1. е4 с5 2. Кf3 d6 3. Сb5+ Кd7 4. с4 Кf6 5. Кс3 е6 6. 0-0 Се7 7. d4 сd 8. К:d4 0-0 9. С:d7 С:d7 10. Се3 а6 11. а4 Фа5 12. Лс1 Лfс8 13. b3 d5 14. е5 Ке8 15. Кdе2 Кс7 16. с5 С:с5 17. С:с5 Ф:с5 18. Ке4 Фb6 19. Кd6 Лсb8 20. Кf4 Ке8 21. Кh5 К:d6 22. еd f5 23. Лс3 Лf8 24. Фd2 Ф:d6 25. Лfс1 Сс6 26. Лg3 Лf7 27. Лсс3 f4 28. Лg5 е5 29. Фе2 Ле8 30. Лh3 h6, 0:1.

* * *

Задача М. Кошаля з мінулага выпуску рашаецца 1. Ке8! Не вядзе да мэты 1. Крb8? з-за 1...Л:d4! Кампазіцыі С. Дарошчанкі рашаюцца так: № 1. 1. Сd4! №2. 1. f6! gf 2. Крf8, 1...~ 2. f7. Першыя правільна адказалі Фёдар Карпей, Васіль Жуковіч, Сяргей Цяльпук, Васіль Барысевіч, Віктар Жук.

**Вадзім ЖЫЛКО.**







# Чытайце ў ліпеньскай «Алесі»

**Кожны нумар часопіса «Алеся» дорыць чытачам цікавыя сустрэчы з жанчынамі Беларусі, яркімі асобамі, таленавітымі кіраўнікамі і ашчадлівымі гаспадынямі. Ліпеньскі часопіс таксама ў гэтым шэрагу.**






### «Мая работа — гэта творчасць кожны дзень!»

Наталля Уладзіміраўна Карчэўская — рэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, актыўны член Беларускага саюза жанчын, мудры педагог, клапатлівая жонка і маці. Адкуль браць энергію і сілы, каб спраўляцца з усімі сацыяльнымі ролямі «на выдатна»? Як знайсці прымяненне сваім талентам і быць карысным людзям? І чаму асабістае шчасце любіць цішыню? Пра гэта і не толькі — аповед Наталлі Карчэўскай для чытачоў «Алесі».

### «Вабяць яе кнігі старадаўнія ...»

Такіх спецыялістаў у Беларусі адзінкі. За амаль пяцьдзясят гадоў работы Галіна Уладзіміраўна Кірэева ўжо навобмацак, па ўласцівасцях паперы, асаблівасцях шрыфту, гравюр, вокладкі, вадзяных знаках можа вызначыць, у якім стагоддзі і якой краіне выдадзена тая ці іншая старадрукаваная кірылічная кніга. Ёй дастаткова аднаго погляду, каб адрозніць «Псалтыр», «Часоўнік» ад «Часаслова» і інш. Паметкі на палях, экслібрысы, аўтографы — усё гэта для Галіны Кірэевай тыя ўказальныя знакі, якія дазваляюць прасачыць шлях кнігі, яе ўласную гісторыю.

### Анатомія разводу

Колькасць разводаў, на жаль, у кожным пакаленні становіцца ўсё большай. З чым гэта звязана? Якія новыя фактары сёння ствараюць пагрозу для шлюбных адносін? У якіх выпадках за сям'ю абавязкова варта змагацца? І калі расстанне ўсё ж непазбежнае, як перажыць яго з найменшымі стратамі? Пра ўсё гэта разважае ў часопісе «Алеся» псіхолаг Таццяна Шаранда.

### І рассыпаўся гарох...

Ці ведаеце вы, што самым папулярным касцюмам з кіно даследчыкі моды называюць сукенку ў гарох Джуліі Робертс, у якой яна з'явілася на конным спаборніцтве ў фільме «Красуня»? Паводле задумы рэжысёра, сукенка павінна была прадэманстраваць пераўвасабленне грубаватай Вівіян у сапраўдную лэдзі. А прыдумала такі вобраз мастачка па касцюмах Мэрылін Вэнс: выбраўшы сукенку ў гарох, яна дадала да яе белыя пальчаткі і элегантны капялюш. Фільму «Красуня» ўжо больш за 30 гадоў, але і сёння ўбор Вівіян — адзін з самых запатрабаваных у пакупнікоў інтэрнэт-крамы «Мой Галівуд».

І гэта невыпадкова. Сукенка ў гарох — вытанчаная класіка, якая ніколі не страціць актуальнасці. Такі строй падыдзе і для заняткаў ва універсітэце, і для работы ў офісе, і для кактэйльнай вечарынкі, і для спаткання — усюды ён будзе дарэчы. Сёння ўзор «гарох» — зноў сярод самых модных трэндаў, але тут ёсць і свае адметнасці. Якія? Пра гэта чытайце ў «Алесі».



### Лета, спёка і водны баланс

Колькі вады піць, каб не нашкодзіць здароўю? Урачы-дыетолагі кажуць, што ў кожнага чалавека свая норма, якая неабходная арганізму для падтрымання водна-салявога балансу на працягу сутак. І такая норма залежыць ад характару і цяжкасці выконваемай работы, ад бытавых умоў, надвор'я і пары года, а таксама ўзросту. У сярэднім даросламу чалавеку ў камфортных умовах неабходна 35—40 мл вады ў суткі на 1 кг масы цела. Гэта прыкладна 2—2,5 літра пры рабоце сярэдняй цяжкасці. Ва ўмовах спёкі і пры знясільваючай рабоце пад пякучым сонцам пітная норма можа дасягаць 4 літраў. Спажываць менш за норму непажадана. Чаму? Даведаецеся пра гэта з артыкула ў часопісе.

### Усе на старт!

Джогінг — слова моднае, з'явілася ў нас нядаўна, паходзіць ад англійскага jogging — бег як «шарканне». На самай справе большасці з нас джогінг добра знаёмы. Гэта бег трушком, або лёгкі бег з хуткасцю 7—9 кіламетраў за гадзіну, што крыху хутчэй за звычайную хаду (4—6 кіламетраў за гадзіну). Для людзей старэйшага ўзросту гэта адзін з самых даступных відаў фізічнай нагрузкі і актыўнага адпачынку. Каму падыходзіць джогінг? Якія ёсць абмежаванні? Якія ландшафты лепш выбіраць? Пра ўсё гэта расказваецца ў нашым часопісе.

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10** «Зона Х». Крымінальная хроніка (16+).
**9.10** Галоўны эфір.
**10.00, 17.05** Дакументальны фільм «Перазвон» (12+).
**10.55, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Суседзі-3» (12+).**
**13.05 Меладрама «Бестселер па каханні» (12+).**
**14.45, 15.25 Серыял «Непагадзь» (16+).**
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**18.15** «Зона Х». Крымінальныя навіны (16+).
**21.00** Панарама.
**21.45** Зразумелая палітыка.
**22.00 Серыял «След» (16+).**
**0.35** Арэна.
**0.50** «Зона Х». Крымінальныя навіны (16+).
**1.10** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 19.30** Тэлебарометр.
**9.05, 20.00** «Зразумець. Даравацьʼ» (16+).
**9.45, 20.35** «Сямейныя гісторыі» (16+) [СЦ].
**10.20** Камень, нажніцы, папера (16+).
**11.00** «На тыдзень» (16+).
**11.50** «Да пабачэння» (16+).
**12.40 Фэнтэзі «Оз: Вялікі і жудасны» (12+).**
**14.05** Анімацыйны фільм «Дынazaўр» (0+).
**16.30** М/ф «Цімон і Пумба» (0+).
**17.00** «Суперлато».
**17.10** «Арол і рэшка. Перазагрузка. Амерыка» (16+).
**18.40** «Багіня шопінгу. Экстрэмальны сезон» (16+).
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНА.
**21.20** «Тата папаў» (16+).
**23.15** Хачу ў тэлевізар!
**23.20 Серыял «Анатомія страсці» (16+).**

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Піражкі па-церахавіцку.
**8.05, 12.00, 20.20** Навіны культуры.
**8.25** «Нацыянальны хіт-парад».
**9.20** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
**9.45** «Легенды кіно». Яўген Еўсцігнееў (12+).
**10.25 «Не можа быць!» Мастацкі фільм (12+) [СЦ].**
**12.20** «Беларуская кухня». Рулька ў піве.
**12.50** «Наперад у мінулае».
**13.15, 21.05** «Апошні дзень». Аляксандр Дзядзюшка (12+).
**13.55, 21.40 «Курсанты». Серыял (16+) [СЦ].**
**15.30** «Навукаманія» (6+).
**16.00 «Авадзень». Мастацкі фільм (12+).**
**19.25** «Напярэдадні Пераможнай Вясны». Канцэрт Тамары Гвердцытэлі «Сіняя хустачка».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**23.15** «263 ночы. Цуд выратавання». Дак. фільм (12+).

## Беларусь 5

**7.00** Азбука спорту.
**7.15** Тэніс. WTA. Прага.
Упершыню каля Летняга амфітэатра арганізуюць вулічны турнір па боксе паміж расійскімі і беларускімі спартсменамі. Навінка таксама — міні-фестываль вулічных кулінараў і музычны цеплаход, які, безумоўна, будзе вельмі запатрабаваным падчас спякоты.

Яшчэ адна нестандартная магчымасць з'явіцца для экскурсантаў — убачыць Віцебск у суправаджэнні мясцовых жыхарак пазамінулага стагоддзя. Іх ролю выканаюць тыя, хто могуць цікава расказаць пра старажытны горад.

У пойме ракі Віцьбы арганізуюць шэраг мерапрыемстваў, у тым ліку адкрытыя турніры па пляжным валейболе, футболе, стрыт-боле... Віцэ-мэр упэўнены, што кожны знойдзе для сябе нешта цікавае.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

БУДЗЬЦЕ Ў КУРСЕ

# З паходам у лес трэба пачакаць

**Забароны і абмежаванні на наведванне лясоў дзейнічаюць у 91 раёне Беларусі, паведамляе БелТА са спасылкай на інфармацыю Міністэрства лясной гаспадаркі.**

Забароны і абмежаванні ўведзены па ўсёй тэрыторыі Гомельскай вобласці. Таксама яны дзейнічаюць амаль на ўсёй тэрыторыі Віцебскай (акрамя Браслаўскага раёна), на большай частцы тэрыторыі Мінскай (акрамя Мядзельскага, Лагойскага, Стаўбцоўскага і Капыльскага раёнаў) і Магілёўскай (акрамя Клічаўскага, Асіповіцкага, Кіраўскага і Бабруйскага раёнаў) абласцей. Што датычыцца Брэсцкай вобласці, то там таксама практычна на ўсёй тэрыторыі вобласці ўведзены забароны (акрамя Баранавіцкага, Брэсцкага, Жабінкаўскага, Камянецкага і Маларыцкага раёнаў).

Забароны на наведванне лясоў уведзены ў некаторых раёнах Гродзенскай вобласці (Астравецкім, Ашмянскім і Смаргонскім), а ў Іўеўскім раёне ўведзена часовае абмежаванне.

На сайце Міністэрства лясной гаспадаркі размешчана інтэрактыўная карта, з дапамогай якой можна аператыўна адсачыць, у якіх рэгіёнах часова забаронена наведваць лясы.

ДОБРЫЯ ТРАДЫЦЫІ

# СВЯТА Ў ВАШУ ВЁСКУ!

## У Бялыніцкім раёне кіраўнік гаспадаркі, старшыня сельсавета і святар аб'ехалі некалькі паселішчаў, каб асабіста павіншаваць людзей

**У аграгарадку Вішоў святыя Пётр і Павел асабліва шануюцца, у іх гонар мясцовы калгас «Радзіма» пабудаваў тут царкву. Кожны год на свята ў ёй праводзіцца вялікае богаслужэнне, удзел у ім бярэ архіепіскап Магілёўскі і Мсціслаўскі Уладыка Сафроній. СВК «Калгас «Радзіма» арганізоўвае канцэрты і робіць падарункі пенсіянерам і ветэранам. Пандэмія ўнесла свае карэктывы ў звыклы лад жыцця, і сёлета кіраўнік гаспадаркі сумесна са старшынёй Вішоўскага сельвыканкама і настаяцелем храма аб'ехалі некалькі вёсак, каб асабіста павіншаваць людзей.**



Настрой жыхарам узнімала творчая група Вішоўскага сельскага Цэнтра культуры і вольнага часу ў складзе яе дырэктара — Алены Хартавай, Валянціны Сільвянковай і Сяргея Панчака. Яны спявалі любімыя ў народзе песні і танцавалі з ахвотнымі іх любімую падэспань.

— Звычайна мы запрашаем народ да сябе, але сёлета ў сувязі з каранавірусам вырашылі праехацца па вёсках і павіншаваць усіх паасобку, — звярнуўся да вяскоўцаў на адным з такіх канцэртаў у вёсцы Навасёлкі **старшыня СВК «Калгас «Радзіма» Аляксандр ЛАПАЦЕНТАЎ.** — Хацелася б, каб гэта было больш масава, але што зробіш. Галоўнае, каб людзі бачылі, што традыцыі працягваюцца, нягледзячы ні на што. У сувязі са складанай міжнароднай абстаноўкай, якая сёння адбываецца ў свеце, хачу супакоіць, што калгас здольны працаваць у тым жа духу. Вы самі бачыце, што і на палях, і на фермах працягваецца стабільная работа. І тыя санкцыі, якія прыняў Еўрасаюз, мы пакуль не адчуваем. Але ўсё залежыць ад працы саміх людзей.





Калісьці вёска Навасёлкі была цэнтрам калгаса-мільённіка імя Леніна. Зараз яго тэрыторыі адышлі да «Радзімы». І кіраўніцтва аграгаспадаркі ўзяло пад сваю апеку ў тым ліку і ветэранаў некалі моцнага калгаса. Аляксандр Лапацентаў згадаў легендарнага старшыню калгаса — удзельніка вайны і заслужанага работніка сельскай гаспадаркі БССР Уладзіміра Скрыцкага, які знаходзіўся каля руля болей чым 40 гадоў. У сярэдзіне 1990-х ён пайшоў з жыцця (пахаваны на мясцовых могілках). Лапацентаў звярнуў увагу на тое, што за магілай старшыні і яго родных павінен быць арганізаваны пастаянны догляд.

— Гэты калгас павінен быў развівацца, — выказаў ён шкадаванні. — Было зроблена ўсё магчымае: падведзены газ, усе камунікацыі, ёсць добрая школа, дзіцячы сад, Дом культуры. Проста скажу: не знайшлося прадаўжальніка ідэй Уладзіміра Фёдаравіча. І я ганаруся, што мы навялі тут і ў наваколлі парадак. І людзей мы не дзелім на нашых і чужых. Вы сёння таксама частка нашай «Радзімы».

Цяпер у Навасёлках жыве каля 150 жыхароў. І кіраўнік калгаса «Радзіма» заклапочаны тым, каб іх праблемы вырашаліся своечасова. «Звяртайцеся, — заклікаў ён. — Чым зможам, дапаможам. Калі не ў стане будзем, выйдзем на больш высокі ўзровень і паспрабуем там вырашыць».

Вяскоўцаў павіншаваў настаяцель храма Святых Апосталаў Пятра і Паўла айцец Павел. Ён заклікаў не забывацца пра веру, любіць і шанаваць Радзіму. «Гэта свята, якое вяртае нас да духоўных традыцый, а яшчэ гэта свята нашай гаспадаркі. І храм, які быў пабудаваны ў Вішове, быў зроблены менавіта для вас. Свята нагадвае нам, што слова Божае было, ёсць і будзе да заканчэння веку», — падкрэсліў ён.

У даўніну свята Пятра і Паўла сімвалізавала канчатак купальскіх святкаванняў і летніх вяселляў, а таксама падрыхтоўку да сенакосу. У гэты дзень традыцыйна ладзіліся святочныя сямейныя абеды і праводзіўся час з блізкімі на прыродзе. Так што фармат, які выбраў для віншавання людзей калгас «Радзіма», можна лічыць народным і сямейным.

— Дзякуючы калгасу наш сельсавет лічыцца адным з самых квітнеючых у вобласці, — падкрэсліў **старшыня Вішоўскага сельсавета Дзмітрый КАРПІКАЎ.** — Паляпшаецца інфраструктура населеных пунктаў, праводзіцца рэгулярнае добраўпарадкаванне. І як вынік — колькасць насельніцтва ў нашым сельсавеце не падае.

Усяго на тэрыторыі сельсавета ў 31 населеным пункце пастаянна пражывае 2500 чалавек, плюс прыязджае 1500 дачнікаў. Вішоўскі сельсавет у Магілёўскай вобласці не толькі адзін з квітнеючых, але і адзін з самых вялікіх.

— Тое, што сам кіраўнік калгаса не абыходзіць нас сваёй увагай, вельмі каштоўна, — адзначыў староста вёскі Уладзімір Салодкі. — Для нас за гонар было прыйсці сюды, каб пачуць віншаванні з яго вуснаў.

Усяго ў гаспадарцы «Калгас «Радзіма» — 250 пенсіянераў і ветэранаў. Усе яны атрымалі да свята падарункі. Канцэрты прайшлі ў васьмі населеных пунктах.

— Культурныя мерапрыемствы вельмі згуртоўваюць людзей, — перакананы Дзмітрый Карпікаў. — Паглядзіце на іх твары, і ўсё стане зразумела. Яны так шчыра ўсміхаюцца. І вельмі прыемна, што кіраўніцтва калгаса «Радзіма» добра адчувае настрой людзей і разумее, як важна іх падтрымліваць.

На свята Святых Апосталаў Пятра і Паўла ў аграгарадку Вішоў прайшло вялікае богаслужэнне, якое вёў архіепіскап Магілёўскі і Мсціслаўскі Уладыка Сафроній. Для ўдзелу ў ім быў арганізаваны падвоз людзей з населеных пунктаў сельсавета.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**
Бялыніцкі раён.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15
ад 17 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.**

**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 14.804.** **Нумар падпісаны ў 19.30 15 ліпеня 2021 года.**

**Алег СУДЛЯНКОЎ:**

# «Шэраг рэдкіх кніг мае каштоўнасць, супастаўную з каштоўнасцю дыяментаў»

## Таямніцы свету бібліяфілаў. За кнігу забівалі, кнігай ратавалі...

**Ад папяровых кніг цяпер пазбаўляюцца.**
**Месца, кажуць, зашмат займаюць... Усё, што трэба, можна ў лічбе прачытаць.**
**Так, прамінулі часы, калі ў савецкіх кватэрах прыкметай дабрабыту былі новенькія томікі, урачыста выстаўленыя за шклом сценкі, набытыя на талончыкі Таварыства кнігалюбаў за здадзеную макулатуру... Сёння тыя дэфіцытныя набыткі нярэдка сіратліва стосамі мокнуць пад дажджом на сметніцах, пыляцца на паліцах букіністычных крам...**
**Але ёсць людзі, якія ва ўсе часы будуюць свой свет вакол Кнігі. Збіраюць, шукаюць, захоўваюць... Пра таямніцы свету бібліяфілаў мы гутарым з вядомым калекцыянерам Алегам СУДЛЯНКОВЫМ.**

### АД АЛЬТРУІЗМУ ДА ЗАБОЙСТВА

***— Калекцыянер часта ўспрымаецца толькі як уласнік, гэткі скупы рыцар...***

— Каб вы ведалі, наколькі гэта не так. Ну, вось прыклад... Аднойчы да вядомага бібліяфіла Івана Нікіфаравіча Завалокі трапіў унікальны рукапіс пратапопа Авакума. Завалока быў чалавекам складанага лёсу, адбыў сямнаццаць гадоў сталінскіх лагераў за тое, што ўзначальваў таварыства стараабрадцаў у Рызе... Страціў на лесапавале нагу. Атрымліваў ён пенсію 27 рублёў. Яму прапаноўвалі прадаць рукапіс Авакума за любыя грошы, асабліва старавееры. Акадэмія навук нават пераяўляла яму за той артэфакт тысячу рублёў... Ён адмовіўся іх атрымліваць. І бясплатна перадаў знаходку ў рукапісны аддзел Пушкінскага дома. І звыш сямісот рэдкіх рукапісаў сваёй калекцыі аддаў таксама.

***— Калекцыянерам гэта ўвогуле ўласціва — такія бескарыслівыя акты?***

— Так. Адзін з найбуйнейшых бібліяфілаў Савецкага Саюза — Алег Ласунскі з Варонежа, ён і цяпер жывы, яму 85 гадоў, усю сваю калекцыю аўтографаў і кніг перадаў ва ўніверсітэт і абласную бібліятэку. Зразумейце, калекцыянеру важна, каб па ім засталася памяць. У Маскве быў створаны музей прыватных калекцый. Ініцыятар яго стварэння, Ілья Зільберштэйн, перадаў туды ўвесь свой збор жывапісу, некалькі соцень палотнаў. Яго прыклад паўтарылі іншыя, у тым ліку вядомы калекцыянер Міхаіл Чуванаў, які аддаў збор ікон. І цяпер у музеі ёсць залы, прысвечаныя Зільберштэйну і Чуванаву.

***— А з другога боку, вядома, што калекцыянер за экспанат, якога ў яго няма, здатны на многае...***

— Так, былі выпадкі, калі забівалі за кнігі. Гісторыя бібліяфільства — драматычная рэч. Калі ты аб'яўляеш, што ў цябе ёсць адзіны ацалелы асобнік нейкай кнігі, а потым нехта кажа, што ў яго другі асобнік... Што рабіць з той другой кнігай? Ці яе спрабуюць купіць, а было, забівалі ўладальніка.

***— А не прасцей знішчыць «лішні» асобнік?***

— Кнігу знішчыць вельмі цяжка — невядома, колькі экзэмпляраў яшчэ ўсплыве. Калі яна была аддрукаваная, ішла цэнзарам, рэдактарам, у выдавецтва. Дзесьці некалькі кніг нават ад знішчанага накладу заўсёды «захрасалі», тага ж «Падарожжа з Пецярбурга ў Маскву» Радзішчава ўжо больш чым дзесяць асобнікаў знойдзена. Тут жарсці вялікія. Шэраг рэдкіх кніг мае каштоўнасць, якая супастаўная з каштоўнасцю дыяментаў. Напрыклад, адна старонка першай друкаванай кнігі, «Бібліі» Гутэнберга, каштуе каля 80 тысяч долараў. А як вы думаеце, якія самыя рэдкія кнігі з існуючых? Падручнік «Буквар» Івана Фёдарава ў ідэальным стане захаваўся толькі адзін, прычым ён знаходзіцца ў



Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

Гарвардскай бібліятэцы, куды трапіў з калекцыі Дзягілева, а Дзягілеў яго купіў у Венецыі.

***— Нагадаю, што наш вядомы даследчык Алесь Суша знайшоў першы беларускі буквар, выдадзены, дарэчы, раней за буквар Фёдарава, у прыватнай лонданскай бібліятэцы ордэна тампліераў.***

— Усё правільна, успомніце, што такое для дзяцей, якія вучацца, іх падручнік — і самая чытаная кніга, і адначасова многімі ненавідная.

***— Падручнікі яшчэ традыцыйна размаўлёўваюць... Дарэчы, а маргіналіі ў кнігах цэняцца?***

— Цэняцца. Яшчэ як. Маргіналіі, усякага кшталту рукапісныя пазнакі. Асабліва калі аўтар сам робіць пазнакі ў сваіх кнігах.

***— Гэта таму, што калі перачытваеш сваю кнігу, заўсёды знаходзіш памылкі...***

— Без памылак не абыходзіцца. Францыска Скарыну і Івана Фёдарава часам называюць не першадрукарамі, а першаабдрукоўшчыкамі — набор жа ўручную быў... Рука здрыганулася — іншая літара трапіла. Часам з-за абдрукоўвак людзі гінулі. Мне расказвалі, як у 1947-м выдалі газету, прысвечаную юбілею Ленінграда. Ніхто не заўважыў, што замест «Слава героям Ленінграда!» на першай старонцы было напісана «Слава героям Ленінгада!». Калі галоўны рэдактар прыйшоў на працу і яму на стол паклалі газету, ён перакрэсліў гэтую фразу, ні слова не сказаў і сышоў. Больш яго ніхто ніколі не бачыў.

### СКІНУЦЦА НА ТРАКТАТ

***— З аднаго боку, чым большы наклад — тым большы прыбытак выдаўца... З другога боку, эксклюзіўныя кнігі каштуюць даражэй...***

— І гэта ўлічваецца. Часам частку накладу робяць адрознай. Напрыклад, зараз выйшла кніга Франсуа Віёна ў выдавецтве «Віта Нова». У пяцьдзясят асобнікаў уклеены арыгінальныя афорты мастака Канстанціна Каліновіча. Летась там гэтак жа выдалі кнігу Гофмана. Каштоўнасць асобнікаў з афортамі, вядома, узрасла ў дзесяць разоў. Французскія бібліяфілы ў XIX стагоддзі выпускалі наклад кніг, скажам, у 300 асобнікаў, з іх 20 асобнікаў — на японскай паперы, 50 — на кітайскай, 100 — на паперы вержэ... Часам нават колер паперы ў часткі накладу можа адрознівацца.

***— Ну, гэта толькі для калекцыянераў цікава...***

— Тым бібліяфіл і адрозніваецца ад кнігалюба. У бібліяфілаў свая шкала каштоўнасцяў. Каму трэба быў у Венецыі «Буквар» Фёдарава, які там знайшоў Дзягілеў? Там у яго была цана зусім смешная ў параўнанні з Расіяй. Знакаміты кніжнік Максіміліян Шык у 1920-х знайшоў кнігу «Гісторыя стварэння помніка героям Плеўны ў Маскве». Ён ведаў, што яна высока цанілася ў царскі час, каштавала 900 рублёў. Гэта вельмі вялікія грошы, калі ўлічыць, што карова каштавала ад 5 да 8 рублёў. Шыку тое выданне было без патрэбы, але ён ведаў, што адзін з найбуйнейшых біліяфілаў, Шыбанаў, ім цікавіцца. Прыйшоў, паказаў знаходку, нібыта не ведае яе цаны. Шыбанаў не падаў выгляду, што зацікаўіўся, — маўляў, каму зараз трэба кніга пра той помнік... Але вунь там куча выданняў на замежных мовах, выберы, на што хочаш яе выменяць. Шыбанаў не ведаў замежных моў, таму не ведаў такіх кнігамі даражыў. А Шык валодаў вольна двума дзясяткамі моў. Пачаў перабіраць і знайшоў поўны камплект журнала «Le Charivari» (выходзіў у Францыі такі часопіс гумарыстычны ў 1830-х гадах). У Шыка гэты часопіс быў, але ў вельмі кепскім стане. А тут — у ідэальным. Шык таксама не паказаў выгляду, што часопіс каштоўны... Шыбанаў кажа: «Ну, бяры гэтую іншаземшчыну». І кожны застаўся ў выйгрышы.

***— Але калі рэдкія кнігі настолькі дарагія, устае праблема з іх набыццём для бібліятэк...***

— Мне дзіўна, што не хочуць у нас пра гэта гаварыць. У нашых бібліятэк сапраўды няма грошай на рарытэты, на пакупку нашых святынь. Але ёсць выхад. Памятаеце, як для Беларусі купілі трактат Казіміра Семяновіча «Вялікае мастацтва артылерыі»? Сабралі 40 тысяч долараў. У любых краінах гэта прынята. У Англіі на аўкцыёне карціна Тыцыяна была ацэнена ў 75 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў. Вярхоўны суд Англіі забараніў гэтую карціну да вывазу, і было прынята рашэнне купіць яе для Нацыянальнага музея. Пяць гадоў збіралі патрэбную суму, але ж сабралі. Пасля смерці балетмайстра Сержа Ліфара, які жыў у Францыі, засталося 12 лістоў Пушкіна — 11 да жонкі і адзін да цешчы. Гэтыя лісты ён хацеў падарыць Пушкінскаму дому, але з умовай: яму дазволяць паставіць два аднаактовыя балеты ў Вялікім тэатры. Ліфар — эмігрант, у яго мелася шмат ворагаў... У Вялікі яго не пусцілі — прапанавалі ставіць у Ленінградскім Малым. Ліфар згадзіўся... Але і там не дазволілі. Дык вось, калі яго ўдава вырашыла прадаць лісты Пушкіна на аўкцыёне, цану выставіла мільён дзвесце тысяч долараў. Расійскія мільянеры сабралі гэтую суму, выкупілі лісты і бясплатна перадалі Пушкінскаму дому.

### БОТЫ З ВОКЛАДКІ

***— Які лёс у кніжных калекцый? На Беларусі дасюль шукаюць вядомыя кніжныя зборы — ад легендарнай Полацкай бібліятэкі Сафійскага сабора да бібліятэк Тышкевічаў і Храптовічаў...***

— Самае сумнае, калі бібліятэкі разлятаюцца. Напрыклад, быў у 1860—1880-х вядомы бібліяфіл Яфрэмаў. У завяшчанні ён загадаў сваю калекцыю распрадаць. А некалькі гадоў таму памёр вядомы навуковец, у якога была ўнікальная бібліятэка па гісторыі Беларусі — і дзе яна? Распалася, ёсць такі тэрмін. Часам калекцыянер загадзя завяшчае сваю бібліятэку... Напрыклад, Сяргей Фарцінскі пры жыцці сорак пяць тысяч сваіх экслібрысаў прадаў расійскай бібліятэцы імя Леніна. Экслібрысы знаходзіліся ў яго, але пасля смерці мусілі адысці бібліятэцы. Знакаміты кніжнік Смірноў-Сакольскі завяшчаў свае зборы з адной умовай: не павінны распадацца. Але яго калекцыя дасюль не мае свайго памяшкання.

***— Я ўжо ведаю, што ў вашых кніжных зборах важнае месца займаюць кнігі Пушкіна і Віёна... А беларускім кнігам там якое месца адведзена?***

— Мяне заўсёды цікавілі беларускія кнігі. Напрылад, меў «Жалейку» Янкі Купалы, калі яе яшчэ не было ў музеі Янкі Купалы. У мяне ёсць аўтографы многіх вядомых беларускіх пісьменнікаў. А колькі кніг знішчана па загадах Галоўліту! Кнігі аўтараў, расстраляных у 1930-х, як правіла, знішчаліся. Калі ў нейкіх выданнях забаронены аўтар проста згадваўся, бібліятэкары сядзелі і выкрэслівалі яго імя. Нядаўна ў Нацыянальнай бібліятэцы была выстава французскіх суперэкслібрысаў. Ведаеце, чаму пасля вайны іх мала засталося, такіх кніг у скураных пераплётах? Таму што скуру з іх пускалі на абутак. Тым больш сярод іх былі кнігі вялікіх памераў, так званыя аўражы. Боты лёгка атрымліваліся. Я сам бачыў такія боты...

***— А ці ёсць у вашай калекцыі рукапісныя кнігі?***

— Так, вядома! Аднойчы Арлен Кашкурэвіч, пабачыўшы ў мяне рукапісныя кніжачкі рускага мастака Палякова, прапанаваў зрабіць такія ж. У якасці тэксту абраў паэму Уладзіміра Караткевіча «Явар і каліна». Яе забаранялі, бо там былі радкі, якія не супадалі з савецкай мараллю. Давыд Гарадзенскі заклікае беларусаў ісці на Марыенбург і Берлін, гераіня загадвае сыну забіваць прусаў, не шкадуючы ні жанчын, ні дзяцей. І такая рукапісная беларуская кніга з'явілася. Пасля ў мяне з'явілася яшчэ адна, з той жа паэмай «Явар і каліна», але з ілюстрацыямі Паўла Татарнікава.

***— Як цэніцца беларуская кніга на сусветным рынку?***

— Скарына вельмі цэніцца. Поўнага збору кніг Скарыны няма ні ў адной бібліятэцы свету. Памятаю, як на ўрачыстасцях, прысвечаных 450-годдзю беларускага кнігадрукавання, прыехаў у Мінск адзін чэшскі прафесар, у яго рукі дрыжэлі, ад шчасця ледзь не плакаў, калі трымаў у руках скарынаўскія выданні.

***— Па якім прынцыпе вы адбіраеце кнігі для сваёй калекцыі?***

— Збіраю тое, што мне падабаецца. Некаторых аўтографаў у маёй бібліятэцы ніколі не будзе.

***— Вялікі кніжны збор і захоўваць нялёгка...***

— Адна з самых знакамітых калекцый аўтографаў належала Маісею Лесману, музыканту-акампаніятару. Каля яго дзвярэй вісела шыльдачка: «Кватэра ахоўваецца дзяржавай». Бачыў яшчэ адну выдатную калекцыю — паштовак, Мікалая Тагрына. У 1940 годзе Ленсавет вылучыў яму пад яе сяміпакаёвую кватэру. Калекцыя ўтрымлівала каля 700 тысяч паштовак. Калі пачалася вайна, да Тагрына прыйшлі з разведупраўлення і папрасілі паштоўкі з відамі гарадоў Еўропы, дзе працавала разведка. Тагрын аддаў усё, што меў. Пасля вайны да яго завітала некалькі афіцэраў, унеслі набітыя мяшкі: «Гэта вам». Ён адкрывае мяхі, а там паштоўкі. Гэта былі не яго паштоўкі, відаць, разведчыкі дзесьці знайшлі калекцыю і вырашылі ў знак удзячнасці яму падарыць. Тагрын да канца жыцця той падарунак сартаваў.

***— Дзе ў найбліжэйшы час можна пабачыць кнігі з вашай калекцыі?***

— У Нацыянальнай бібліятэцы, на выставе рукапісных кніг. Там вы пабачыце і згаданыя дзве кніжкі з паэмай «Явар і каліна».

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

Памяць

# ПА СЛЯДАХ 42-Й СТРАЛКОВАЙ ДЫВІЗІІ

## Пошукавікі з Іркуцка прыехалі ў Магілёў, каб ушанаваць памяць сваіх землякоў



Фота аўтара.

**Таццяна УЛЫБІНА і Любоў САХАЦКАЯ— настаўніцы, кіраўніцы пошукавых атрадаў «Сібір» і «Вернасць». Разам са сваімі выхаванцамі — школьнікамі і студэнтамі, якім усяго па 16-18 гадоў, яны пераадолелі некалькі тысяч кіламетраў, каб пабываць у тых мясцінах, дзе ваявалі ўраджэнцы іх краю. Дывізія, дарэчы, брала ўдзел і ў абароне, і ў вызваленні Беларусі.**

— Мы тут дзякуючы вашаму **пошукавіку Сяргею ТАГАЕВУ**, з якім два гады таму завязалася наша перапіска ў інтэрнэце, — расказала кіраўнік атрада «Сібір» з сяла Алха Іркуцкай вобласці Таццяна Улыбіна. — Пачалі абменьвацца інфармацыяй, а потым ён прапанаваў прыехаць у госці. Нашы маладыя людзі з задавальненнем адгукнуліся на запрашэнне. Мы з імі разам пабывалі не ў адной пошукавай экспедыцыі і ведаем, што самыя моцныя пачуцці перажываеш менавіта на месцы колішніх падзей. 42-я стралковая дывізія прайшла праз усю Беларусь, і Магілёў стаў першым горадам на шляху сібіракоў.

Пошукавікі Магілёўскага абласнога гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба «Вікру» арганізавалі для гасцей пазнавальную экскурсію. Расіянам паказалі невялічкі фільм пра дзейнасць клуба, які сёння налічвае каля 150 чалавек. **Кіраўнік «Вікру» Мікалай БАРЫСЕНКА** пазнаёміў з прадметамі, знойдзенымі на месцах раскопак, расказаў, як захоўваецца памяць пра герояў вайны ў Беларусі. У тым ліку і байцоў узвода 42-й стралковай дывізіі пад камандаваннем Трафіма Яскіна, які першы фарсіраваў Дняпро і ўзяў плацдарм каля вёскі Дабрэйка Шклоўскага раёна.

Сам камандзір пры гэтым быў цяжка паранены, а ўвесь узвод цалкам загінуў. Трафім Яскін усё жыццё перажываў, што для яго байцоў, якія былі яшчэ зусім маладыя хлопцы, гэты рубеж стаў апошнім. Ён аб'ездзіў усе архівы, сабраў па кожным з іх поўную інфармацыю. А яшчэ зрабіў памятную пліту, якую у канцы 80-х гадоў мінулага стагоддзя прывёз у Шклоўскі раён і паклапаціўся, каб яна была ўстаноўлена на месцы кровапралітных баёў. Сібіракі перадалі сваім калегам з Магілёва дакументальны фільм, дзе Яскін успамінае ваенныя падзеі і расказвае пра сваіх «хлопчыкаў». Ён перажываў, што не ім, а іншым, якія ішлі па іх слядах, дасталася слава герояў. Атрымалася як у той песні: «Погибает у болота первый взвод вторая рота, ордена получит кто-то...» Узвод Яскіна загінуў да таго, як паспеў замацавацца на адваяваным рубяжы, і подзвіг яму не залічылі.

— Трэба аднавіць справядлівасць, — пераканаНая Таццяна Улыбіна. — Мы маем усе доказы таго, што ўзвод Яскіна быў першы. Ён сам пакінуў нам усе дакументы, якія гэта пацвярджаюць. А яшчэ прасіў свайго сына Аляксандра, які стаў гісторыкам, каб той таксама нешта зрабіў для памяці герояў вайны. Аляксандр звярнуўся да нас, сваіх калег, і было прынята рашэнне аб'яднацца ў пошукавую арганізацыю «Даніна памяці». Для нас вельмі важна, каб нашчадкі ведалі сваіх сапраўдных герояў. Сёння ў нас шмат паслядоўнікаў з ліку моладзі, мы разам ездзім па месцах былых баёў і дзеці выхоўваюцца на рэальных прыкладах.



З тым, што баявыя заслугі ўзвода Трафіма Яскіна павінны быць ушанаваныя, згодныя і магілёўскія пошукавікі. Такія спробы рабіліся і раней, але прыезд іркуцкіх калег стаў яшчэ адным штуршком.

— Яскін прывозіў доказы, што яго ўзвод быў першы, вельмі перажываў з-за таго, што заслугі па ўзяцці заваяванага крывёю яго байцоў плацдарма забралі іншыя, — пацвердзіў Мікалай Барысенка. — Але на той момант нічога змяніць не атрымалася. Цяпер зрабіць гэта ў межах былога Савецкага Саюза немагчыма, але можна выправіць несправядлівасць на мясцовым узроўні і абазначыць гэта ў мемарыяльным знаку.

У расіян была магчымасць пабываць на месцы былых баёў і ўшанаваць подзвіг мужных вызваленцаў.

— Мы перажылі ў гэты момант вельмі моцныя пачуцці, — прызналіся іркуцкія пошукавікі. — Мірнае сённяшняе поле, дзе каласіцца жыта і лётаюць птушкі. І сэрца сціскаецца, калі ўспамінаеш, што тут грымела вайна і гінулі зусім маладыя людзі.

На сустрэчы ўспаміналі імя яшчэ аднаго знакамітага сібірака — двойчы Героя Савецкага Саюза, камандзіра двойчы Чырванасцяжнай 43-й арміі Афанасія Белабародава. У Віцебску ёсць музей баявой славы гэтай арміі, якая насіла яго імя, а самому герою прысвоена званне ганаровага грамадзяніна гэтага горада.

— Прадстаўнікам нашага атрада аднойчы пашчасціла прыехаць у Віцебск і наведаць гэты музей, — падзялілася кіраўніца атрада «Вернасць» Любоў Сахацкая. — Там яны сустракаліся з сынам генерала — Уладзімірам. Гэта была вельмі цёплая і плённая сустрэча, у нас з'явіліся новыя звесткі пра героя і шчырыя сябры. Дарэчы, наша школа носіць імя гэтага военачальніка.

Сёння атрад «Вернасць» налічвае 32 чалавекі. Некаторыя з тых, хто захапіўся пошукам яшчэ ў школе, ужо студэнты, але па-ранейшаму ў страі. Пошук, як той казаў, зацягвае.

Пасля Магілёва сібіракі адправіліся ў Мінск, а потым у Брэст. Таццяна Улыбіна падзялілася, што калісьці да яе звярнуўся сын чырвонаармейца Кісліцына з просьбай даведацца пра лёс зніклага без вестак бацькі. Мяркуецца, што яго сляды губляюцца дзесьці ў раёне Брэста.

— Сын героя летась памёр, але я абяцала яму, што буду шукаць, — кажа Таццяна Улыбіна і дадае: — Мы і нашу моладзь выхоўваем так, каб помнілі пра кожнага героя. І я ведаю, што ніколі не скажуць, як некаторыя: «Ну колькі можна ўспамінаць пра гэтую вайну, столькі гадоў прайшло, каму гэтыя ўспаміны патрэбныя?»

Дарэчы, уражанні ад Магілёва ў гасцей засталіся самыя цёплыя. Тут іх сапраўды прымалі як сваіх. **Дырэктар Магілёўскага электратэхнічнага каледжа Віктар БУРАКА** забяспечыў транспартам і пражываннем, «віккруўцы» арганізавалі экскурсіі па мясцінах баявой славы, звазілі на мемарыяльны комплекс «Буйніцкае поле».

— Сібіракі пакінулі пасля сябе самыя цёплыя ўражанні, — прызнаўся пошукавік клуба «Вікру» Сяргей Тагаеў. — Гэта ж толькі ўявіць сабе, колькі дзеці праехалі, каб убачыць усё на свае вочы. Толькі да Магілёва дабіраліся чатыры дні. Мне прыемна, што яны не расчараваліся ў нас, бо ўбачылі, што нашы людзі таксама неабыякавыя. І памяць для нас — не пусты гук.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ВЫКЛІКІ І МАГЧЫМАСЦІ АЗІЯЦКАГА ХАРАКТАРУ

**У Ташкенце (Узбекістан) праходзіць міжнародная канферэнцыя «Цэнтральная і Паўднёвая Азія: рэгіянальная ўзаемазвязанасць. Выклікі і магчымасці». Беларускую дэлегацыю на канферэнцыі ўзначальвае першы намеснік прэм'ер-міністра Мікалай СНАПКОЎ. У склад дэлегацыі ўваходзяць дырэктар Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў Алег МАКАРАЎ, намеснік дырэктара БІСД Віталь СТАХОЎСКІ, кандыдат эканамічных навук, дацэнт, дактарант кафедры міжнародных эканамічных адносін факультэта міжнародных адносін Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Вольга МАЛАШАНКАВА, навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аляксей ДЗЕРМАНТ.**

Ініцыятыва ўмацавання рэгіянальнай узаемазвязанасці вылучана Прэзідэнтам Рэспублікі Узбекістан Шаўкатам Мірзіёевым у кантэксце новай адкрытай знешнепалітычнай стратэгіі Ташкента. Дадзеная ініцыятыва скіравана на далейшае паглыбленне эканамічнага супрацоўніцтва ў Цэнтральнай Азіі з выхадам на Паўднёвую Азію, якая гістарычна цесна прывязаная да ўзбекскага, цэнтральнаазіяцкага рэгіёна — як у эканамічным, так і ў сацыяльным, культурна-цывілізацыйным вымярэннях.

Міжнародная канферэнцыя высокага ўзроўню «Цэнтральная і Паўднёвая Азія: рэгіянальная ўзаемазвязанасць. Выклікі і магчымасці» заклікана сфарміраваць палітычную і экспертную пляцоўкі для шматбаковага абмеркавання мадэлі ўзаемавыгаднай стратэгічнай сувязі «Цэнтральная Азія — Паўднёвая Азія» ў транспартна-лагістычнай, энергетычнай, гандлёвай, вытворчай, інвестыцыйнай, тэхналагічнай і культурна-гуманітарнай сферах. У канферэнцыі, якая праходзіць у Ташкенце 15—16 ліпеня, удзельнічае больш за 250 прадстаўнікоў звыш 40 краін і міжнародных арганізацый. Асвятляе работу гэтай знакавай міжнароднай дыскусійнай пляцоўкі каля 90 журналістаў. 15 ліпеня ў фармаце канферэнцыі адбылася ўрачыстая цырымонія адкрыцця ў Ташкенце Міжнароднага інстытута Цэнтральнай Азіі (МІЦА). Удзел ва ўрачыстасцях узялі міністры замежных спраў краін Цэнтральнай Азіі і эксперты.

З прывітальным зваротам да ўдзельнікаў канферэнцыі звярнуўся генеральны сакратар ААН Антоніу Гутэрыш. З уступным дакладам выступіў Прэзідэнт Рэспублікі Узбекістан Шаўкат Мірзіёеў. У адкрыцці паўдзельнічалі кіраўнікі замежных дзяржаў і ўрадаў, міністры замежных спраў розных краін, кіраўнікі міжнародных фінансавых арганізацый.

Першае секцыйнае пасяджэнне прысвечана наступнай тэме: «Гандлёвая і транспартная ўзаемасувязь для ўстойлівага росту». Размова пра мадэрнізацыю эканомік Цэнтральнай і Паўднёвай Азіі ў кантэксце ўмацавання міжрэгіянальнай узаемазвязанасці; пра магчымасці развіцця транспартна-камунікацыйнай узаемазвязанасці ў Цэнтральнай і Паўднёвай Азіі, уключаючы праекты па пашырэнні дзеючых і будаўніцтве новых транспартных калідораў; пра прыярытэтныя кірункі супрацоўніцтва з замежнымі і міжнароднымі фінансавымі інстытутамі. Другая секцыя — «Адраджэнне культурна-гуманітарных сувязяў як шлях да ўмацавання дружбы і ўзаемнага даверу», дзе разглядаюцца супрацоўніцтва ў сферы вывучэння, захавання і прасоўвання гісторыка-культурнай спадчыны Цэнтральнай і Паўднёвай Азіі, узаемадзеянне ў сферах адукацыі, сацыяльнай падтрымкі і абароны інтарэсаў моладзі, аховы здароўя, навукі і тэхналогій, экалогіі, турызму. Трэцяя секцыя — «Рэгіянальная бяспека. Выклікі і пагрозы».

У пярэдадзень канферэнцыі **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Узбекістан Леанід МАРЫНІЧ** у інтэрв'ю карэспандэнту інфармацыйнага агенцтва «Дунё» адзначыў: «Правядзенне ў Ташкенце буйной міжнароднай канферэнцыі высокага ўзроўню можна разглядаць як яшчэ адзін вялікі крок узбекскага боку і ўсіх рэгіянальных партнёраў, накіраваны на далейшае паглыбленне эканамічнага супрацоўніцтва ў Цэнтральнай Азіі з выхадам на Паўднёвую Азію. Можна з упэўненасцю сказаць, што пры паспяховым запуску гэтага праекта ён стане пачаткам эпохі адраджэння ўсёй палітры гістарычных сувязяў паміж двума буйнейшымі азіяцкімі рэгіёнамі. Акрамя таго, хацеў бы адзначыць вялікую колькасць удзельнікаў з іншых рэгіёнаў. Беларусь, нягледзячы на некаторую геаграфічную дыстанцыю ад эпіцэнтра дадзенага праекта, гатовая ўзяць у ім актыўны ўдзел. Нам гэты рэгіён цікавы з двух прычын. Нашы краіны сёння маюць цесныя эканамічныя і палітычныя адносіны, нашы кіраўнікі дзяржаў адзін аднаго падтрымліваюць практычна ва ўсіх пытаннях. Нельга не падкрэсліць, што дзяржавы — удзельнікі сённяшняй канферэнцыі з'яўляюцца аднымі з найбольш значных эканамічных партнёраў нашай краіны. Беларусь мае трывалыя гандлёва-эканамічныя сувязі і актыўна развівае супрацоўніцтва з Узбекістанам і іншымі краінамі Цэнтральнай Азіі, а таксама з Пакістанам, Афганістанам, Індыяй. Упэўнены, што сумесна з нашымі ўзбекскімі партнёрамі мы зможам прапанаваць практычны вопыт, эфектыўныя тэхналогіі і шырокую гаму прадукцыі і паслуг для рэалізацыі праекта. Кампетэнцыі сусветнага ўзроўню ёсць у беларускіх кампаній у галіне інфармацыйных тэхналогій, горназдабываючай прамысловасці, будаўніцтва і эксплуатацыі чыгункі, тэхнікі і абсталявання.

Асобна хацеў бы падкрэсліць, што прадстаўнічую беларускую дэлегацыю ўзначальвае першы намеснік прэм'ер-міністра Мікалай Снапкоў. У нас у межах візіту запланавана вялікая колькасць сустрэч і перагавораў, у тым ліку з партнёрамі з іншых краін.

Упэўнены, што ташкенцкі форум высокага ўзроўню дасць унікальную пляцоўку для абмеркавання найбольш актуальных пытанняў, якія закранаюць інтарэсы азіяцкага рэгіёна...»

Несумненна, высновы, зробленыя аўтарытэтнымі беларускімі ўдзельнікамі прэстыжнай канферэнцыі, лягуць у падмурак адносін Беларусі з Узбекістанам і іншымі азіяцкімі краінамі.

**Сяргей ШЫЧКО.**




## ТРЭБА СЛУХАЦЬ ДЗЕДА

Праўду кажуць: не ўсё тое збываецца, на што чалавек спадзяваецца. Вось і ў нашых работнікаў культуры накладка выйшла: надоечы, перад Купаллем, не знайшлося ахвотнага на ролю дзеда Яўсея...

Што рабіць? Прыйшлося выручаць самадзейных артыстаў.

...Тэкст ролі я атрымаў за суткі да прадстаўлення. Прачытаў, парадаваўся, што нічога складанага, апроч таго, што ў пачатку дзеда звалі Яўсеем, а бліжэй да канца — чамусьці Аўдзеем. Але ж размова не пра тое.

...Адкрыў мерапрыемства народны калектыў аднаго з Дамоў культуры — файна праспявау купальскія песні! І потым мог бы застацца на месцы — паслухаць іншых. Аж не — дружна рушыў у аўтобус, каб там пасядзець, пачакаць астатніх (а хоць бы дзеда Яўсея... З Аўдзеем) ды паехаць дамоў.

У чаканні, праўда, час амаль не ідзе...

А на сцэне, між тым, усё было паводле сцэнарыя: моладзь шукала папараць-кветку і правярала на шчырасць каханне, дзед (той самы) дзяліўся сваёю бядой: маўляў, засунуў ён бутэлечку ў кубелец з зернем, а яна ўзяла ды разлілася... Баба здуру курэй накарміла...

Калі «дзед» нарэшце ўсё расказаў і зайшоў у аўтобус, іншыя артысты былі павесялелыя, бо, як выглядала, кульнулі пакрысе — адзначылі ўдалае выступленне... На «Яўсея», што быў раней пры пасадзе, зірнулі з насцярогай і хуценька прыбралі пляшку. Туды ж, у сумку, апусцілі акуратныя лустачкі пірага ды аддалі каманду ехаць, а то ж, маўляў, затрымаліся, час позні, а посгех можна і дома адзначыць.

...Як пачуў назаўтра «Яўсей», сарвалася гэтае «мерапрыемства»! І ўсё таму, што з бутэлечкай у сумцы зрабілася тое ж, што у кубельцы з зернем — перакулілася, бедная!

А зрэшты, бедная мо была не яна, а гаспадыня, што абы-як паставіла? Альбо куры ці гусі...

Як ні круці, а трэ было глядзець купальскае прадстаўленне! Бо калі чалавек нешта бачыць, чуе альбо чытае, то міжволі набіраецца розуму.

**Аляксандр Матошка,**
*Расонскі раён.*

## ДОМ ПАД ЛІПАМІ,
### альбо Хто папярэджаны, той узброены

Прыкмета часу: з досыць шырокага кола нашых знаёмых будуюцца толькі трое: пляменнік узяў крэдыт на кватэру, сусед — узводзіць гараж на лецішчы, супрацоўнік дабудоўвае ў вёсцы лазню. А вось некалі...

Тады, у дзевяностых гадах мінулага стагоддзя, дачны бум быў у самым разгары: ледзь не кожны паважаючы сябе прафкам (і наш таксама) як кот з селядцом насіўся са спісамі ахвотных будавацца, ён жа вышукваў і ўсімі праўдамі-няпраўдамі «прабіваў» участкі зямлі.

Як правіла, гэта былі няўдобіцы — хмызнякі ды пагоркі, былыя пясчаныя кар'еры, на якіх нічога не расло, бо проста не магло — па вызначэнні...

Але ж нават яны — асабліва блізу горада і па ходу электрычкі — лічыліся шчасцем. Ну як жа — сам Колас пісаў, што зямля не зменіць і не здрадзіць!

І таму, каб займець яе і ўжо там свой кут, — людзі страсалі апошнія грошы, залазілі ў даўгі, ездзілі «чаўночыць», шукалі блату і даставалі будаўнічыя матэрыялы, з рук у рукі (па сваіх супрацоўніках бачыла) перадавалі нумары тэлефонаў... Круціліся, карацей, як вавёркі ў колах.

Цягнула туды і маю каляжанку Тоню. Ёй вельмі хацелася быць як усе, гэта значыць, мець лецішча. Дзеўка, відаць, спала і бачыла свой домік на беразе сажалкі пад старымі ліпамі, малявала яго, замаўляла праект...

Гэта з аднаго боку, а з іншага — мама аднекуль з-пад Жытоміра — пагагчы дачэ не магла, мужа ў сваё 35 Антаніна не мела, грошай свабодных — таксама...

Выйсцем было адно — шукаць мужчыну.

З імі (супрацоўнікі ведалі) Тоні шчасціла, а часцей не шчасціла, бо нават каханні каля яе чамусьці не трымаліся...Казалі, праўда: пасля аднаго пад ліпамі застаўся падмурак намаляванага доміка, пасля другога — спісаны будаўнічы вагончык.

Зрэшты, я, відаць, не ўспомніла б іх (як і саму Антаніну), бо лёс нас звёў і развёў — я памяняла работу, але ж...

Неяк, гадоў праз пяць, муж сказаў, што Дзяніс, яго армейскі сябра, надумаў паставіць дачу, хоча параіцца і папрасіць грошай. Справа, значыць, сур'ёзная, вечарам павінен зайсці.

...Справа гаспадыні тады — сабраць на стол (госць прыйшоў з каньяком) ды прывецціць. А далей...

Мужчыны размаўлялі і выпівалі, я займалася дзецьмі і гаспадаркай, але ж па абрыўках фраз разумела, што за будоўлю (да таго ж — не маючы грошай) Дзяніс не браўся б, аднак... Ну дужа ж прывабнае месца: у трыццаці кіламетрах ад Мінска і ў трох — ад прыпынку электрычкі... Да таго ж сам участак проста на дзіва — восем сотак (нашым ды іншым давалі тады па пяць), на беразе сажалкі (?), пад старымі ліпамі (?!).

Пасля гэтых слоў мне ўжо хацелася «ўклініцца» ў мужчынскую размову, спытаць у госця, ці ведае ён, як завуць суседку? Але ж той расказваў сам: што таварыства ўжо не новае, што электрычнасць і вада падведзены, што ўрадлівай глебы людзі навазілі, сады пасадзілі і домікі паставілі... Што пустуюць хіба лічаныя ўчасткі: у яго суседкі, напрыклад, толькі вагончык стаіць!..

Зрэдку, але ж часам здараецца — я варажыла знаёмым па руцэ, казала пра лініі сэрца, розуму, лёсу...

Вось і тут падышла да Дзяніса, папрасіла паказаць далоні. Сказала, што той участак зямлі не яго, што за будоўлю яму лепш не брацца.

— Гэта чаму ж?! — абурыўся госць.

Давялося растлумачыць, што, мяркуючы па руцэ (ды і не толькі...), чалавек ён досыць рамантычны і ўлюблівы, што чарговае каханне (а Тоня — я ведала — свой шанц не ўпусціць) можа напаткаць яго якраз на дачы і што тады пад пагрозай апынецца не толькі яго будоўля, але і сям'я...

— Ды кінь ты!.. Не дуры галаву! — зашумелі на мяне працаверазеўшыя мужчыны. — Хірамантка знайшлася! Ідзі адсюль!

Я пайшла, сказаўшы, што мая справа — папярэдзіць чалавека, а яго — думаць ды вырашаць.

...Як там ні было, але грошай Дзянісу мы пазычылі, і дачу пад ліпамі ён паставіў.

А вось адносіны з суседкай, казаў, не склаліся, бо (даслоўна) «ліпла, — як тая смала, а я ўжо быў папярэджаны».

...Народ сказаў: папярэджаны — значыць узброены.

**Таццяна Гайко,**
*г. Мінск.*

## ХАВАЙЦЕ ВАШЫ ГРОШЫКІ...

Гэтую гісторыю мне расказаў мой муж — відаць, пад вельмі добры настрой, бо звычайна з яго слова не выцягнуць.

Дык вось. У нашым двары два шматкватэрныя дамы, і ў адным з іх жыве Міхась — аптыміст, весялун... Каля яго пад'езда ўсе мужчыны збіраюцца (нават цяпер, калі Міша на пенсіі), а ўжо некалі раней... І пажартаваць з ім можна было, і новых анекдотаў наслухацца, і нарагатацца, а часам дык яшчэ і песню падхапіць: Міхась зацягваў...

Так было і ў тую нядзельку: мужчыны з абодвух дамоў акружылі Мішаву лавачку, завялі гамонку пра грошы. Коля і кажа:

— Праблема з імі...

— Праблема без іх! — папраўляе Міхась.

— Як быццам ты ведаеш? — сумняваюцца мужчыны. — Дальнабойшчыкі ж добра зарабляюць! І жонка твая пры грашах...

— Ага. Якраз яна і вінаватая: ад'язджала ў санаторый, — сказала, каб я доларай купіў... Ну схадзіў я па іх, ну прынёс, а далей што рабіць — куды іх схаваць?.. Бо я ж такі — дзверы гады ў рады замыкаю. Забываюся... А нехта ж можа зайсці...

— Грошы ў банку лепш трымаць, — слушна заўважыў Пятро.

— Во... А гэта ідэя! — узрадаваўся Міхась. — Давай яшчэ па адной і па дамах, бо заўтра ж на работу.

...Раніцай ён ледзь не праспаў! Потым цэлы дзень займаўся рамонтам сваёй машыны. І толькі бліжэй да вечара стаў успамінаць учарашнюю размову пра грошы і думаць, куды ж ён іх паклаў?

...Дома пачаўся вобыск. У ходзе яго былі перагрэсаны ўсе рэчы ў шафах і шафках, увесь посуд на паліцах і ў тумбачках, агледжаны ўсе куты і закуточкі (нават трубы ў прыбіральні)... Грошай нідзе не было.

Мішу зрабілася млосна, і ён падаўся на вуліцу: сеў на лавачку, закурыў. Амаль тут жа побач з'явіліся ўчарашнія сабутэльнікі, спыталі:

— Ты чаму не ў гуморы?

— Я ў трансе! — адказаў ім Міхась. — Не ведаю, што і рабіць — хоць вяроўку намыльвай...

— Чаму?!

— Ды заўтра жонка дамоў вяртаецца, а я не помню, дзе грошы дзеў.

— Дык мы ж казалі, што ў банк іх трэба, што тады працэнты...

— У банк? — ажывіўся Міхась, падхапіўся з месца і куляй памчаў дамоў.

Там, спехам агледзеўшы ўсе магчымыя пустыя слоікі ў кухонных ды іншых шафках, ён нарэшце дайшоў да поўных, што стаялі ў халадзільніку і...

На ніжняй паліцы, у самым кутку, за каструлямі ўбачыў сімпатычны паўлітровічак з нечым незразумелым. Дрыжачаю рукою выцягнуў («Няўжо мая згуба знайшлася?»), зняў накрыўку, пераличыў. Грошы былі на месцы.

І таму гаспадар зноў паклаў іх у банку і паставіў у халадзільнік, бо — цікавая ж схованка: злодзей наўрад ці знойдзе!.. А жонка — няхай прыязджае і няхай пашукае лепшую.

**Таццяна Новік,**
*г. Клецк.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

**Ад яе ж.**

Як пераканаліся нашы чытачы, «Слоўнік эпітэтаў беларускай мовы» не хлусіць: гісторыі бываюць абсурдныя, амурныя, анекдатычныя, банальныя, абуральныя, дзівосныя, ідыёцкія, камічныя, кранальныя, павучальныя, скандальныя, трагікамічныя... А ўжо колькі праўдзівых — за час існавання рубрыкі...

Для тых, хто забыўся, нагадаем, што ў апошнія гады яна стала конкурсам на найлепшую. Вынікі яго падводзяцца ў пачатку года. Журы — і вялікае чытацкае, і малое рэдакцыйнае — працуюць. Пішыце. І, калі ласка, **з нумарам тэлефона для аператыўнай зваротнай сувязі!**

Неасабісты суб'ектыў



# ПРАЗ НАВАЛЬНІЦУ

## Як нараджаецца жыццёва важнае веданне

АДРАЗУ, яшчэ ў душным выхадзе з метро, пацягнула водарам блізкага дажджу. Ужо на вуліцы стала зразумела: ён будзе вельмі хутка, вось ужо першыя цяжкія кроплі пляскаюць па нагрэтай зямлі, а хмары, якія яшчэ хвілін дваццаць таму здаваліся далёкімі і цёмна-свінцовымі, апынуліся непасрэдна над галавой — светла-шэрыя, рэдзенькія, бы зношаны зрэбны кужаль. Можна было дабегчы да транспарту і праз дзесяць хвілін сядзець у гарачай кватэры, гледзячы на залеву са свайго сёмага паверха. Але нешта ў галаве было такое рамантычнае, згадалася Янішчыц са сваім «Акном у дождж» (Памятаеце: «...Без парасона, нарасхліст // Мудрэй адчуць, як волі вучысь // Зеленароты мокры ліст»). Карацей, смела ступіўшы пад шэрыя хмары, сапраўды без парасона, я нацягнула ружовы плашч-дажджавік і жвава пакрочыла ў сваё Сухарава.

Рамантычна-паэтычны настрой знік, як толькі вельмі блізка паласнула першая маланка і ўдарыў па вушах гром — бы ў вялізны металічны таз. Дзецца асабліва не было куды — якраз ішла па вялікім прагоне паміж прыпынкамі, заставалася толькі рухацца наперад, трымаючыся падалей ад пасаджаных абапал дарогі высокіх ужо ліп. Навальніца лютавала над галавой, дождж ліў бы з вядра, мокрыя ўшчэнт басаножкі давялося зняць, бо яны толькі паскудна чвякалі на нагах, замінаючы хадзе. Сяк-так дабралася да невялікага ляска, праз які зразаю шлях дадому. Там было сушэй і не так грымела, але дзесьці ў верхавінах вялізных елак нешта гуло і стагнала, і ад гэтага было не нашмат весялей. Заставалася толькі прыспешваць хаду і кпіць з самой сябе: знайшла прыгоду на сваю галаву, ды дзе — ледзь не ў цэнтры вялікага горада!..

А дома, ачомаўшыся і развесіўшы сушыць дажджавік і сукенку, якую ён мала ад той залевы засцярог, я задумалася зусім пра іншае. Калі, у які менавіта момант у жыцці, навальніца з найвялікшага дзіва, ад якога аж займала дух, да якога цягнулася рукой з надзеяй калі не злавіць, дык хоць дакрануцца б, ператварылася ў падсвядомы страх, ад якога міжволі ўцягваеш галаву ў плечы? Што робіцца з чалавекам, у які момант ён мяняе ўласныя прыярытэты, ці ёсць для гэтага моманту нейкія падставы або ўсё робіцца само па сабе?

Я ж сапраўды любіла навальніцу — апантана, бясстрашна. Памятаю, калі яшчэ не хадзіла ў школу, бабуля адцягвала мяне ад акна літаральна за ногі, а я чаплялася за фіранкі, бо так жа хацелася пагледзець на гэтую казачную яркую прыгажосць. Ужо падлеткам я выбягала на вуліцу проста ў залеву, радасна скакала па лужынах, расставіўшы рукі, падстаўляла небу твар, бы чакаючы ад маланкі пякельнага пацалунка. Ведала: небяспечна, смяротна небяспечна, але ж так цягнула, так падабалася гуляць з агнём... І нават у дваццаць пяць разумнейшай я не стала — адкрывала насустрач маланцы шырокае гарадское акно, цягнула да яе далоні, пісала ёй, маланцы, вершы: «Як старыя каханкі, мы зліліся ў істоту адну. І нікога не трэба, апроч спадарожнага ветру...»

УСЁ змянілася адным ліпеньскім вечарам. Я тады ехала ў родную вёску на апошнім пятнічным аўтобусе. Ісці з яго было кіламетры чатыры, але ж так не хацелася начаваць у душнай кватэры... Як толькі аўтобус ад'ехаў ад прыпынку, пакінуўшы нас з яшчэ трыма спадарожнікамі на пустой і ўжо паўцёмнай дарозе, пачалося нешта. Раўло прама над галавой, стары парк каля дарогі стагнаў, дрэвы хіліліся да зямлі. У небе круціліся нейкія шэрыя віры, нібы варыва ў пякельным катле. Вось гэта была сапраўдная навальніца, тая, у цэнтры якой я заўжды марыла апынуцца. Спачатку маланка падпаліла старое дрэва ў парку — труха ў дупле ўспыхнула, бы паходня, і нават лівень не здолеў патушыць гэтае вогнішча. Пасля яна лупанула прама пад ногі майго спадарожніка, які ішоў крыху наперадзе. Мужчына войкнуў і прысеў на кукішкі, абхапіўшы галаву. Пасля ўстаў, хістаючыся пайшоў далей, прыгаворваючы: «Нічога не чую...» Наступнай ахвярай сталі двое цялят, якіх гаспадары не паспелі забраць з пашы — ярка бліснула зусім побач, моцна загрымела — і праз міг жывёлы ўжо нерухома ляжалі ў мокрай траве...

Як я дайшла дадому жывая — ведае толькі Бог. Літаральна, бо я, не ведаючы што рабіць, пачала чытаць Ісусаву малітву — пра «ўратуй і змілуйся» — аднекуль усплыла з закуткоў памяці. Ішла, не спыняючыся, і чытала яе раз за разам. А маланка лупіла зусім побач, у паверхню возера, і, здавалася, варта прыслухацца лепш — і пачуеш, як яе стрэлы шыпяць, судакранаючыся з вадой...

З таго часу я не тое што баюся навальніцы. Проста ведаю, якая гэта страшная неўтаймаваная сіла, за якой можна назіраць. Але толькі на адлегласці, а яшчэ лепш — з якога памяшкання.

А чаго гэтыя аналогіі, спытаеце? Мне здаецца, нешта падобнае перажывае пэўная частка нашага грамадства. Тое, што здавалася таким прывабным і прыгожым, з чым хацелася судакрануцца, да чаго прычыніцца, аказваецца страшнай віхурай, неўтаймоўнай стыхіяй. Апынуўшыся ў яе эпіцэнтры, ты ўжо не належыш сабе і можаш стаць ахвярай, і нікому не важныя твае самыя светлыя пачуцці і самыя высакародныя намеры...

